**Аддзел адукацыі спорта и турызму Карэліцкага райвыканкама**
**ДУА «Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа”**

# ЗБОРНІК МЕТАДЫЧНЫХ РАСПРАЦОВАК

# “ПРАЗ СВЯТУЮ МУДРАСЦЬ ДА ПАЗНАННЯ СВЕТУ”




Аўтары-складальнікі:

Гунько Алена Аляксандраўна - кіраўнік тэатральнай студыі “Батлейка”;

Сас Людміла Сяргееўна - музычны кіраўнік;

Коцік Кацярына – вучаніца 11 класа,

Сінкевіч Аліна – вучаніца 11 клас

Забаўскі Іван - вучань 10 класа

УДК 373

ББК 74. 200. 68

В58

Рэкамендавана метадычным саветам ДУА “Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа”
Составитель:

Рэцэнзенты: Г.А. Шугала, дырэктар ДУА “Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа;
Т.В.Гарох, наместнік дырэктара па выхаваўчай рабоце ДУА “Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа”

**В58Зборнік метадычных распрацовак “Праз святую мудрасць да пазнання свету”:**з вопыта работы / аўт.скл . Гунько Алена Аляксандраўна - кіраўнік тэатральнай студыі “Батлейка”, Сас Людміла Сяргееўна - музычны кіраўнік, вучні10,11 класаКоцік Кацярына, Сінкевіч Аліна, Забаўскі Іван – 2016. – 69с.

У прапанаваных матэрыялах прадстаўлены вопыт работы педагогаў-іннаватараў, вучняў 10-11 класаў, якія лічаць мэтазгодным бясспрэчныя ісціны чалавечнасці , духоўнасці транслíраваць праз пастаноўку біблейскіх легендаў , сцэнак з народнага жыцця маральна-этычнага зместу. Пры гэтым выкарыстоўваюцца магчымасці народнага традыцыйнага тэатра “Батлейка”, інтэрактыўныя гульні, аповеды пра сімволіку і значэнне народных батлеечных касцюмаў, музычныя кампазіцыі, якія паказваюць прыгажосць прыгажосць мелодыі і зместу.

Адрасаваны для азнаямлення і выкарыстання ў рабоце класным кіраўнікам, педагогам-вахаваццелям.

УДК 373

ББК 74.200.68

З58
© А.А. Гунько і інш., склад.,2016
©ДУА « Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа”, 2016

**Праз святую мудрасць да пазнання свету**

Зборнік метадычных рапсрацовак

Адказны за выпуск  Т.В. Гарох
Камп’ютарны  набор  Т.В. Гарох
Падпісана ў друк   11.04.2016
Бумага писчая. ФарматА4

Надрукавана  на прынтары ДУА  « Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа”, 231443, агр.Турэц,

**Змест**

Прдмова……………………………………………………………………..3
Запрашэнне ў казачнае падарожжа “У далёкім горадзе “Віфлееме”………...5
Творчая сустрэча-разважанне “А дабро на зямлі мацней за ўсё”……………12
Сустрэча-адкрыццё “Я ёсць. І гэта такое вялікае шчасце”…………………20
Тэма “Прашу прабачэння”……………………………………………….26
Тэма “Бог даруе грэх”…………………………………………………….28
Дадатак 1.”Вялікдзень, Вялікдзень – найвялікшы дзень”…………………… 30
Дадатак 2. “Легенда аб ружах”…………………………………………….39
Дадатак 3. “Радасна мы славім Бога”………………………………………  41
Дадатак 4. “Матулечка Божая, матулечка добрая”………………………….48
Дадатак 5. Сцэнарый свята “Саракі”…………………………………………… 53
Дадатак 6.”Самы каштоўны плод”…………………………………………….58
Дадатак 7. Фотагалерэя тэатральнай студыі “Батлейка”……………………  .60

## Прадмова

Прыйшоў такі час, калі нашы дзеці, бывае, пачынаюць і заканчваюць свой дзень каля камп'ютэра. І гэта, з аднаго боку, можа і добра. У дадзенай сусветнай павуціне захавана шмат каштоўнай інфармацыі, магчымасці для смаўдасканалення, самавызначэння. Жыццё імклівае, не заўсёды мы можам сёння хутка знайсці інфармацыю ў кнігах, часопісах, журналах. І калі спяшаешся, няма калі многа думаць, разважаць. А гэтаму абавязкова патрэбна навучыцца, падрыхтаваць сябе да ўспрымання інфармацыі, да адбору з яе вялікай колькасці патрэбную і неабходную для сябе, для ўмення супастаўляць розныя жыццёвыя факты, зрабіць правільны жыццёвы выбар, умення імкнуцца зразумець свае думкі і думкі акружаючых людзей .

Канечне, камп'ютэр патрэбны, каб ён толькі служыў для развіцця ісцінна сапраўдных каштоўнасцей чалавека. Але як часта можна бачыць, як на прасторах віртуальнага свету глуміцца святасць, а на змену дабрыні, духоўнай прыгажосці прыходіць жорсткаць, імкненне да нажывы, хцівасць, хлуслівыя выказванні пра пустыя "радасці" жыцця.

Мудрыя дарослыя – педагогі, бацькі – павінны адшукаць такія сродкі, якія маглі б дасканала, доказна паказаць іншы свет для дзяцей, дзе духоўнае пераважае над матэрыяльным. Дзе жывуць рамантычныя, і ўтой жа час рэальныя героі, што распаўсюджваюць свет дабра, справядлівасці, разумення чалавечых жыццёвых каштоўнасцей. Зварот да жывой кнігі, дзе неўміручыя словы размаўляюць з чалавекам, дзе бруіць невычэрпная крыніца душэўнага задавальнення і натхнення.

У рамкаў інавацыйнага праекта вучні 10-11 класаў на факультатыве "Асновы праваслаўнай культуры" падрабязна вывучаюць гістарычны, духоўны і маральны вопыт беларускага народа, яго традыцыйны сямейны уклад, святы, будзённыя дні праваслаўных хрысціян. Каштоўнасць у тым, што маладыя людзі знаходзяць для сябе тую ісціну, што чалавецтва не згінула, нягледзячы на стыхіі, войны, няшчасці таму, што заўсёды існаваў на зямлі незвычайны цуд, знішчыць які не змог ніхто. Гэта дух,самасвядомасць асобы, творчы дар – сапраўдны цуд у свеце прыроды, які робіць чалавека чалавекам.

Розум Царкоўных ісцін, святых людзей, што некалі перапісвалі кнігі ў старажытных манаскіх келлях – гэта свет, які дайшоў да нас, і ён здольны паказаць і нам, сённяшнім людзям правільны жыццёвы шлях.

Педагогі-інававатары, вучні старэйшых класаў лічаць мэтазгодным бясспрэчныя ісціны чалавечнасці , духоўнасці трансліраваць праз пастаноўку біблейскіх легендаў , сцэнак з народнага жыцця маральна-этычнага зместу. Пры гэтым выкарыстоўваюцца магчымасці народнага традыцыйнага тэатра "Батлейка", інтэрактыўныя гульні, аповеды пра сімволіку і значэнне народных батлеечных касцюмаў, музычныя кампазіцыі, якія паказваюць прыгажосць прыгажосць мелодыі і зместу.

Задача, у імя вырашэння якой аб'ядналіся вучні, педагогі, прадстаўнікі бацькоўскай грамадскасці – далучыць слухача, гледача да разумення сутнасці чалавечага жыцця; зацікавіць гісторыяй развіцця духоўнай культуры народа, фарміраваць пачуццё асабістай адказнасці за стан прыроды, за сваё жыццё і здароўе, разуменне і імкненне жыць па законах гуманнасці, міласэрнасці.

Удзельнікі творчай групы праводзяць творчыя пасяджэнні ў групах дзіцячага садка, у сацыяльным прытулку для дзяцей з сем'яў СНС, у доме адпачынку для ветэранаў вайны і працы, ажыццяўляюць выступленні перад жыхарамі рэгіёна падчас правядзення царкоўных свят. Аснова дзейнасці творчай групы – вывучэнне гісторыі праваслаўных свят, распрацоўка сцэнарыяў духоўна-маральнай накіраванасці, дзе абавязковым з'яўляецца выступленні ўдзельнікаў тэатральнай студыі "Батлейка".

Само традыцыйнае мастацтва батлейкі - сінтэтычнае мастацтва, яно развівае самыя розныя здольнасці: акцёрскія, рэжысёрскія, драматургічныя, музычныя, мастацкія, дызайнерскія, архітэктурныя, сталарныя, мадэльерныя, шавецкія, літаратурныя, моўныя, гістарычныя і шмат іншых. Гэта ўніверсальны і эффектыўны сродак фарміравання асобы чалавека, негледзячы на сваю старадаўнасць.

Мы разумеем, што на сучасным этапе развіцця інфармацыйнага грамадства ўзнікла неабходнасць творча падыходзіць да вывучэння культуры народа, яго духоўнай спадчыны. Час патрабуе чагосьці новага, каб зацікавіць вучняў. На наш погляд, значную ролю ў гэтым напрамку адыгрывае магчымасць акунуцца ў эпоху старажытнай беларускай культуры, дакрануцца да жывой гісторыі нашага народа, здзейсніць своеасаблівае падарожжа праз час.

**Запрашэнне ў казачнае падарожжа "У далёкім горадзе Віфліеме"**

**Аўтары:** музычны кіраўнік ДУА "Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа дзіцячы сад-сярэдняя школа" Сас Л.С.., педагог дадатковай адукацыі Гунько А.А., вучань 10 класа Забаўскі А., вучаніца 11 класа Сянкевіч А.

**Мэта:** фарміраванне і захаванне менталітэту, арыентаванага на хрысціянскіх каштоўнасцях

Задачы:
- узбагачаць слоўнікавы запас, развіваць цікаваць да гісторыі Хрысціянства;
-дапамагчы дзіцяці адчуць радасць жыцця ад цікавага падарожжа па святых месцах;
- выхоўваць чуласць дзіцяці да праваслаўных духоўна-маральных каштоўнасцей

**Мэтавая аўдыторыя:** выхаванцы дашкольных груп ДУА “Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа”, ДУА “Ярэміцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа”

Фактары, якія вызначаюць паспяховасць дадзенай практыкі:
- мерапрыемства праводзіцца з выкарыстаннем актыўных гульнёвых тэхналогій, з удзелам яркіх батлеечных персанажаў, з паказам спектакля з частай зменай падзей;
- стварэнне творчай атмасферы, камфортных умоў, у якіх як удзельнікі спектакля, так і гледачы адчуваюць сваю значымасць, запатрабаванасць
-супрацоўніцтва з настаяцелем Свята Пакроўскай царквы, выкладчыкам нядзельнай школы пры Турэцкай царкве Святога Покрыва

## Апісанне практыкі і тэхналогіі рэалізацыі

Правядзенне мерапрыемства: запрашэнне выхаванцаў ў казачнае падарожжа, знаёмства з горадам Віфліемам, прагляд лялечнай пастаноўкі “Маленькі пастух і вялікі разбойнік” з прыцягненнем у спектакль выхаванцаў, выхкананне песні разам з выхаванцамі “Ціхая ноч”, правядзенне конкурса на лепшае чытанне верша “Калядны вечар – святы вечар”, праслухоўванне пропаведзі настаяцеля.

Тэхналогія рэалізацыі:
Для правядзення мерапрыемства неабходна:
1. Падрыхтоўка касцюмаў і дэкарацый, выраб батлеечных лялек.
2. Упрыгожванне зала згодна задуме мерапрыемства.
3. Развучванне песні “Ціхая ноч”.
4. Развучванне вершаў духоўнай тэматыкі.

## Рэкамендацыі па правядзенню мерапрыемства

Для правядзення мерапрыемства Запрашэнне ў казачнае падарожжа “У далёкім горадзе Віфліеме” неабходна:
1. Распрацаваць прграму.
2. Прыцягнуць да удзелу ў паказе спектакля вучняў установы адукацыі, прадстаўнікоў бацькоўскай грамадскаці з мэтай дапамогі ў падрыхтоўцы касцюмаў і дэкарацый, упрыгожвання залы.
3.Распаўсюдзіць аб’явы аб мерапрыемстве.
4. Падрыхтаваць песні і вершы духоўнай накіраванасці.

**Ацэнка эфектыўнасці практыкі**

Мерапрыемства пабудавана на канцэпцыі, адэкватнай сучасным напрамкам выхаваўчай работы. Практыка аб'ядноўвае намаганні педагогаў і вучняў ДУА "Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа", прадстаўнікоў бацькоўскай грамадскасці, нядзельнай школы пры Турэцкай Свята Пакроўскай царкве, стварае ўмовы для фарміравання асноў духоўнасці і маралі асобы на аснове хрысціянскіх каштоўнасцей, акамуліраваных на працягу тысячагоддзяў нашай праваслаўнай Царквой. Дадзенае мерапрыемства абуджае ў кожным дзіцяці пачуццё радасці ад усведамлення сябе часткай прыгожага дзейства, таго, што жыццё вакол незвычайнае, поўнае новага, цікавага, нязведанага.

*Матэрыялы для афармлення:* рэпрадукцыі карцін мастакоў эпохі Адраджэння, свечкі, упрыгожаная елка, лялечны тэатр "Батлейка", відэасюжэт "Які цудоўны гэты свет", мультымедыйны праектар, карта, дзе пазначаны горад Віфліем.

**Ход мерапрыемства**

**Гучыць лірычная мелодыя, на фоне якой Фея святасці вітае гасцей і запрашае ў падарожжа**. Добры дзень вам, дарагія дзеткі, жадаю ўсім цудоўнага настрою і моцнага здароўя. Сёння я запрашаю вас усіх у цудоўнае падарожжа у далёкі горад Віфлеем ( паказвае на карце), дзе нарадзіўся Ісус. Хрыстос. Ітак, адпраўляемся ў падарожжа.(імітацыя гуку поезда). А зараз мы спынімся ў цудоўнай прыгожай даліне, дзе шмат травы і кветак. Чуеце шум. Гэта анёлкі. Яны нам хочуць нешта сказаць.

**Вядучы:** Анёлак белакрылы агонь дабра нясе,
І свет цудоўны, чысты няхай убачаць усе.
Агонь ад яго свечкі, як зорка замігціць,
І свет дабра, цудоўны, нас кліча , зіхаціць.

**1 Анёлак:** Дзве тысячы гадоў таму ўрачыста
На небе ўзышла зорка ноччу мглістай.
Я з весткай паляцеў да пастушкоў
Аб тым, што сёння Бог на свет прыйшоў.
Песня: Калі Збаўца Дзіўны



**2 Анёлак** : У новым горадзе Віфлееме
Сын Божы нарадзіўся.
Не марудзьце, не чакайце,
Да Віфлеема паспяшайце!*Момант з п'есы "Маленькі пастух і вялікі разбойнік"*

**Вядучы:** Той ноччу, калі па ўсёй авечай пашы разлілося ззянне нябеснага пасланца, маленькі пастух таксама пачуў вестку пра нараджэнне Божага Сына.**Праводзіць гульню для выхаванцаў і бацькоў "Напоўнім падарункамі яслі Хрыстовыя"**

**Вядучы. (запрашае бацькоў і дзетак стаць у круг, прапаноўвае сканструіраваць яслі, дзе ляжаў маленькі Ісусік. Выхаванцы і бацькі складаюць яслі з падручнага матэрыялу). Затым пытаецца ў дзетак:**
-Дзеткі, а што б вы падарылі Ісусу Хрысту?
**Адказы дзяцей:**
1. Я панясу маленькаму збавіцелю свечачку, каб яму было светла ў пячоры.
2. Я аддам сваю любімую цацку, каб яму было весела.
3. Мы радаснай песняй прывітаем нашага Збавіцеля
**Вядучы. (звяртаецца да Феі і дзяцей**). Паважаная Фея, жадаем Вам і Вашым такім добрым дзеткам цікавага падарожжа ў горад Віфлеем. (дзеці садзяцца на крэслы, падарожжа прадаўжаецца).
Гучыць лірычная мелодыя. На экране з'яўляюцца краявіды горада Віфліема. Трансліруецца відэасюжэт "Які цудоўны гэты свет". ( Гул поезда заціхае, дзеці пераходзяць у наступны зал, дзе размешчаны дэкарацыі паводле дзейства, размяшчаецца тэатр "Батлейка".)
Выхаванцам раздаюцца канверцікі з малюнкамі. Фея праводзіць з імі інтэрактыўную гутарку.
**Фея.**Дарагія дзеткі, адкрыйце канверцік, і паглядзіце, якія заданні-малюначкі там размешчаны. Пастарайцеся выканаць заданні.
1. У мяне намаляваны прыгожы сад. Мне патрэбна яго расквеціць living рознымі фарбамі.
2. Мне патрэбна прачытаць верш пра любоў да родных і блізкіх, пра прыгажосць свету.( выхаванцы ствараюць выставу малюнкаў "Які цудоўны гэты свет", чытаюць вершы, выконваюць песні)
**Фея.**А цяпер я запрашаю вас, дзеткі і вашых бацькоў у госці да пастушкоў, якія вырашылі наведаць маленькага Ісусіка, па дарозе сустрэлі разбойніка, дапамаглі яму стаць добрым чалавекам. Добрыя ўчынкі здольныя рабіць цуды.
***<u>Дзея ў батлейцы</u>***

**Маленькі пастух:** – Што ж мне прыпаднесці ў дар Божаму Сыну? Вось вазьму сваю коўдру, яна такая цёплая. Налью збаночак малака. Паднясу яшчэ і кавалачак хлеба з салам. Больш у мяне нічога няма.
І хоць мае дары і вельмі бедныя, але ад усяго сэрца.
**Вядучы:** У гэтай мясцовасці драпежнічаў вялікі разбойнік. Са сваёй пячоры ён бачыў яркае святло над пашай для авечак. Чуў радасныя спевы, але не мог зразумець іх слоў. Таму зноў задумаў нядобрае.
**Разбойнік:** Яны адзначаюць свята, а я сяджу адзін у сваёй пячоры, ды страўнік бурчыць ад голаду. Можа, падкрасціся да іх і разнюхаць, што там украсці.

**Вядучы:** Ледзьве разбойнік выйшаў з сваёй пячоры, адразу ж яму давялося схавацца за дрэвам, бо паўз яго адзін за адным ішлі пастухі. Яны цягнулі кошыкі з сырам і мёдам, неслі за плячыма мяхі, поўныя воўны, а адзін нават вёў з сабою ягня. Апошнім ішоў маленькі пастух.

**Разбойнік:** Ноша ў гэтага малога пастушка відаць цяжкая. Напэўна, тут можна разжывіцца. Гэта мне даспадобы. Падкрадуся бліжэй і забяру ў яго клункі. Хто так ляскае зубамі? Хто гэта мне мяшае?
**Маленькі пастух:**Што з табою, добры чалавек?
**1 стрэчны:**Я мерзну. Ад холаду не магу спаць.
**Маленькі пастух:**У мяне ёсць цёплая коўдра. Вазьмі, калі ласка. Я нёс яе для Маленькага Божага Сына. Думаю, што яму спадабаецца, калі ў цябе будзе Яго коўдра.

**1 стрэчны:** Вялікі дзякуй, пастушок. Кланяйся ад майго імя Божаму Сыну.

**Разбойнік:**Ён падарыў коўдру, якую я хацеў украсці! Ну, я, яму….

**Маленькі пастух:**Дарога няблізкая. Перадыхну крышачку. ( Плач ) Хто ж гэта так горка плача?
Дзяўчына, што з табою здарылася?

**2 стрэчны:**Я хачу піць. Ад смагі я не магу заснуць. А ісці да калодзежа далёка і цёмна.
**Маленькі пастух:**Вось, вазьмі збанок. У ім малако. Папі і не плач. Маленькаму Божаму Сыну, напэўна, спадабаецца, калі ты пап’еш малака, якое я нясу Яму ў дар.

**2 стрэчны:** Дзякуй табе, добры пастушок. Пакланіся ад мяне маленькаму Збаўцу.

**Разбойнік:** Ён аддаў малако, якое я хацеў украсці! Ну. Пачакай жа. Я да цябе дабяруся. Ох, і бурчыць мой страўнік. Есці хачу.

**Маленькі пастух:**Гэй, чалавеча! Гэта ў цябе ў жываце так жудасна бурчыць? Увесь час я чую за сабою гэтае буркатанне. Бедны чалавек, як мне шкада цябе, ты ж галодны.Вось, вазьмі і з’еш гэты кавалачак хлеба з салам. Я нёс гэта Маленькаму Божаму Сыну. Думаю, што яму спадабаецца, калі я пачастую цябе Яго падарункам. Еш, еш. Цяпер мне давядзецца з пустымі рукамі стаяць перад маленькім Сынам Божым. Але ўсё ж такі я хачу пайсці прывітаць Яго і сказаць, што я рады Ягонаму нараджэнню.
**Разбойнік:** Ты гэта пра каго гаворыш?
**Маленькі пастух:**Дарагі чалавек, сёння незвычайная ноч. Анёлак абвясціў, што нарадзіўся Сын Божы, Збаўца наш Ісус. Я іду прывітаць Яго і пакланіцца.
**Разбойнік:** ( шэптам убок) Калі нарадзіўся Сын Божы, напэўна там збяруцца багатыя людзі і будзе шыкоўнае свята. Можа і мне штосьці перападзе…
**Маленькі пастух:**Можа і ты пойдзеш разам са мною?
**Разбойнік:** Можна і пайсці
**Песня “Неба і зямля”**
**Вядучы:** Прыйшоўшы ў Віфлеем, разбойнік вельмі здзівіўся, бо не ўбачыў багатага палаца. Перад ім была пячора ў якую заходзілі і выходзілі простыя людзі.

Маленькі пастушок і вялікі разбойнік, калі зайшлі, убачылі старога чалавека і маладую Маці. Божае Дзіця ляжала ў яслях, дзе нічога не было пасцелена, акрамя жменькі сена і некалькіх пялюшкаў. Марыя ціха спявала свайму сыну.

***<u>Верхні ярус батлейкі. Марыя спявае.</u>***

Спі, мой маленькі Сыночак,
Збаўца свету.
Выбачай, мой галубочак,
Беднасць гэту.
Няма чым Цябе, нябожа,
прыкрываці,
Твае ручанькі прыгожа
спавіваці.
Не пагардзіў Ты прыйсці так
На свет гэты.
У сукеначку ў мяне Ты не адзеты

**Маленькі пастух:**Кланяемся табе , Божае Дзіця! Прымі ж Маці Марыя ад нас паклон і нашу ўдзячнасць.

**Марыя:** Глядзі, мой Сынок Ісус, да цябе прыйшоў маленькі пастушок і прывёў з сабою вялікага разбойніка. Вітаем, вас!

**Разбойнік:** ( ціха да пастушка) Пастушок, тут штосьці не так. Вялікім разбойнікам ніхто не ўсміхаецца, ніхто іх не вітае. Можа я ўжо не вялікі разбойнік?

**Марыя:** Прабач, але мне здаецца, што ты мог стаць вялікім пастухом. Ты такі дужы. Дужыя пастухі заўсёды патрэбныя.

**Разбойнік:** Я паспрабую стаць вялікім пастухом.

**Вядучы:** Яны развіталіся і выправіліся ў дарогу, назад, на авечую пашу — два пастухі: маленькі і вялікі.

**Фея запрашае выхаванцаў і бацькоў стаць у кружок, узяцца за рукі і выканаць песню "Ціхая ноч" разам з удзельнікамі тэатра "Батлейка"**

**Песня "Ціхая ноч"**

*Муз. Грубера, сл. Н. Арсенневай*

1.Ціхая ноч, святая ноч!
Усё спіць, сніць сны даўно.
Толькі Маці Святая не спіць
Ціха ў яслях люляе дзіця -
Спі, Сыночак малы,
Люлі, люлі, спі.
2.А ўгары ўсё гарыць
Серабром зорных крыг,
Хор анёлаў пяе пастухам
Аб дзіцяці, што будзе Хрыстом,
Светлай песняй хвалы
Славяць Збаўцу зямлі.
3. Ціхая ноч, святая ноч!
У родны край завітай,

Людзям сум і тугу разгані,
Хай жа цешацца ў гэтыя дні,
У ціхую, святую!
У ціхую, святую ноч!

**Фея.**Напярэдадані светлага свята нашы маленькія падарожнікі падрыхтавалі вершы пра ўслаўленне свята, пра радасць жыцццяя, дабро, значэнне дабра ў нашым свеце.

**1 выхаванец.**
Каляда, Каляда, на зямлі — Святы Вечар,
Нарадзіўся у яслях Збавіцель і Бог.
І пасталі бярозаў танклявыя свечкі
Паабапал заснежаных, белых дарог.

**2 выхаванец.**
Холадна. Мо таму, што зіма на парозе,
Адчуваецца лютасць суровай пары,
А у полі пустым па шырокай дарозе
Плачуць нечаму сумна ліхія вятры.

**3 выхаванец.**
Чым жа сэрцы сагрэць, як той холад адужаць?
Ці агеньчыкам цьмяным у сялянскім акне,
Калядою святой, што насуперак сцюжам
Цеплынёй чалавечыя сэрцы крane?

**4 выхаванец.**
Каляда, Каляда... Нават зорам трывожна.
Па заблытаных сцежках крутога жыцця
Да сваіх ў гэты вечар спяшаецца кожны,
Дзе ў сям'і за сталом нас чакае куцця.

**5выхаванец.**.Сена пах, яліны, стаяць розныя стравы,
Прытаміўшыся, маці шчасліва маўчыць.
Садзяцца сыны на шырокія лавы,
Што сышліся дамоў, каб душой адпачыць.

**6выхаванец.**.Добра сесці разом, слязу радасці ўцерці,
Адчуваць, што ў застоллі побач браты,
У душы чысціня і узнёслыя сэрцы,
Бо з людзьмі разам Бог ў гэты Вечар Святы.

**7выхаванец..** Сёння сэрцам з усімі куццю раздзяляем,
Хто за стол наш не змог на вячэру прыйсці,

Усіх далёкіх і родных сваіх ўспамінаем
І дабра ўсім і шчасця жадаем ў жыцці.

**8выхаванец.**.Няхай будзе вам цёпла, бы ў бацькавай хаце,
У гэтым свеце шырокім, дзе столькі дарог.
Няхай людзі зямлі для вас будуць, як брацця,
І жыццёвыя сцежкі прастуе вам Бог.
А любоў, чалавечнасць мацуе рады!
(На экране выява сонца, фея ўручае дзецям сімвалічныя падарункі за вершы)
Званок, які абвяшчае, што падарожжа закончана, дзеткі вяртаюцца ў першы пакой, які сімвалізуе сваю Радзіму – Беларусь. Прысутных сустракае настаяцель Свята Пакроўскай царквы, гаворыць словы віншавання, уручае падарункі.
**Вядучы-педагог.** З цяплом у сэрцы мы пабывалі сёння з вамі ў святых месцах. Вобраз Ісуса Хрыста для нас – гэта сімвал панавання хрысціянскай любві. Няхай ваша жыццё, крок за крокам, дарагія дзеткі, напоўніцца радасцю і любоўю. Няхай шчырыя ўсмешкі і добрыя словы сустракаюць вас кожны дзень
А на наступны занятак Фея падрыхтавала нам з вамі сюрпрыз. А што гэта за сюрпры, мы ў бачым з вамі заўтра. А цяпер, да новай сустрэчы, добрага вам усім здароўя.

**Творчая сустрэча-разважанне “А дабро на зямлі мацней за ўсё”**

**Аўтары**: Гунько Алена Аляксандраўна, педагог дадатковай адукацыі, кіраўнік тэатральнай студыі "Батлейка", Коцік Кацярына, вучаніца 11 класа.
**Задачы:** фарміраваць духоўную культуру навучэнцаў праз знаёмства з біблейскімі легендамі; развіваць цікавасць да гісторыі хрысціянства, уменне даваць ацэнку учынкам у суадносінах з маральнымі нормамі і якасцямі.
**Мэтавая аўдыторыя:**вучні 1-6 класаў установы адукацыі.
**Абсталяванне:**рознакаляровыя шары, лялечны тэатр "Батлейка", лялькі.
**Структура творчай сустрэчы:**
1. Прывітанне-запрашэнне ў краіну дзівосаў і адкрыццяў;
2. Гульня-размінка "Жыццё наша рознакаляровае";
3.Прагляд і абмеркаванне п'есы "Цар Ірад";
4. Фізкультурная паўза-размінка "Скажы пра дабро без слоў"
5. Рэфлексія "Мы развітваемся, каб сустрэцца зноў"

## Ход сустрэчы

1. Прывітальнае слова педагога. Гутарка-пагружэнне.

Добры дзень, паважаныя дзеткі і дарослыя. Нягледзячы на суровы мароз, няхай у вас у душы заўсёды пануе вясновы настрой, свет дабрыні і цяпла асвятляе вашы душы. Сёння я хачу запрасіць вас у таямнічую краіну, дзе дабро перамагае зло, дзе жывуць людзі з прыгожай душой, з прыгожымі думкамі.

Вы, пэўна, назіралі, як з маленькага парастка вырастае прыгожая яркая кветка, якая загадвае кожны раз звяртаць на сябе ўвагу**? Чаму мы кожны раз звяртаем увагу на кветачку?**

- Яна захапляе нас сваёй прыгажосцю.

Мы назіраем кожны раз, як кветачка цягнецца насустрач сонцу, як закрывае свае пялёсткі вечарам, як жыве сваім незвычайным жыццём.
А як вы думаеце, лёгка расці кветачцы з маленькага парастка?

- Не заўсёды лёгка. Патрэбна сіла, жаданне імкнуцца да жыцця, цягнуцца да сонца.

Правільна, рабяты, імкнуцца да сонца, рабіць добрыя ўчынкі не так проста. Патрэбна мужнасць, сіла, цвёрдасць духа.

**2. А жыццё наша рознакаляровае.(гульня-размінка)**

З пэўнай колькасці рознакаляровых шарыкаў выбраць шар свайго любімага колеру. Затым прыдумаць асацыятыўны рад колеру.

Прыкладныя асацыятыўныя рады: чырвоны колер- прыгажосць, актыўнасць, неспакой, яркі добры ўчынак, імкненне шмат ведаць….

Зялёны колер – спакой, ўраўнаважанасць, шчырасць пачуццяў, дружба, дабрата. У выніку утвараецца рознакаляровая палянка дзяцей з паветранымі шарыкамі – сімвал прыгажосці і імкнення да добрых спраў.

**3. Біблейская легенда “Цар Ірад” – сімвал вечнага імкнення да перамогі дабра над злом.( прагляд п’есы)**

**П’ЕСА “ЦАР ІРАД”**

***Дзея першая***

**Пастушок 1:**

Гэй ты, праца пастухова!
На жалейцы цэлы дзень грáць задумлівым каровам,
Ды хвалу нябёсам пець.
Сонца з нас вачэй не зводзіць, ветрык - сябра пастуху.
Шкада Збаўца не прыходзіць вызваляць нас ад граху.

**Спеў:**

*У начную ціш ляціць голас звыш.*
*Пастушкі ўстаньце, вунь на неба гляньце.*
*Што за яснасць, за праменні*
*У белым анёлы адзенні*
*Радасна спяваюць.*

***(з ’яўляецца Анёл)***

**Пастушок 2:**

Ад страху мову заняло, а вушы ловяць песні, гранне...
Глядзіце! Бачыце? Анёл сыходзіць з неба ў зорным ззянні!

**Спеў:**

*Абвяшчаю вам Бог радзіўся там*
*У Бэтлеем спяшайце,*
*Збаўцу прывітайце .*
*Ляжыць у жлобе ён на сене*
*У пялюшках, без аддзення*
*Ад зімна дрыжыць.*

**Анёл:**

Ганіце свой страх, пастухі,
Нібы авечы статак логам...
Пачуйце светлую з навін
Аб нараджэнні Сына-Бога!


*Рэпетыцыя п’есы “Цар Ірад”*

**Пастушок 3:**

Хутчэй ідзём да Бога на паклон!

***Песня “Учора з вячора”***

Учора з вячора засвяціла зора
Зора засвяціла, свет узвесяліла.
Свет узвесяліўся, Хрыстос нарадзіўся.
Хрыстова нараджэнне - людзям на збаўленне.

***Дзея другая***

**Ірад:**

Я - Ірад. Тут я валадару.
Жыву, купаюся ў раскошы,

Дарую літасць і караю.
Мая ўлада - меч і грошы.
На галаве маёй - карона,
На целе - залатыя строі.
Я не аддам палац і трон свой.
**Д’ябал:**
Цару, мой цару,
Любы ўладару,
Ты тут спіш, гуляеш,
Пуза сабе наядаеш,
А што ў тваім царстве
Новы цар з’явіўся не знаеш.
**Ірад:**
Гэй, варта!
**Ваяка:**
Аць-два, аць-два, аць-два, стой!
Я тут як тут, найяснейшы пане!
Спяшу паведаміць, мой цару,
Здалёку трое пілігрымаў
У твой палац прыйшлі.
**Ірад:**
Дзе тыя трое?
**Ваяка:**
За дзвярыма.
**Ірад:**
Тады пусці іх. Хай заходзяць.
**Мудрацы:**
Мы - тры каралі з Усходу –
Вітаем цябе, Уладар!
Цябе і тваю гасподу:
Каспар
Мельхіёр
Бальтазар.
**Бальтазар:**
Кароль нарадзіўся новы,
Ён свету прынёс збаўленне.
**Ірад:**
Схаваная ў вашых словах
Пагроза майму праўленню.
Бо пэўна ён мае зброю
І войскам вялікім дужы?
**Каспар:**
Пагрозы тваёй кароне няма.
Ісус - пастыр душаў.
**Ірад:**

Панове, будзем ладзіць пір?
Чаму дасюль пустыя шклянкі?
**Мельхіёр:**
Хай за сталом пануе мір.
Мы ў Бэтлеем! Не да гулянкі.
***(Мудрацы выходзяць)***
**Д'ябал:**
Трэба наладзіць у Бэтлееме "кіндэр-капут",
Каб ніадно дзіця не ўцалела.
**Ірад:**
Дзякуй, Люцыпар, парада якраз.
***(Ірад звяртаецца да Ваякі)***
Гэй, варта!
**Ваяка:**
Аць-два, аць-два, аць-два, стой!
Я тут як тут, найяснейшы пане!
**Ірад:**
Хуценька збірайся, у Бэтлеем выпраўляйся,
Усіх немаўлят забівай, свайго цара-гаспадара выручай.
Не паўтараю я двойчы загад.
**Ваяка:**
Слухаю пана, служыць яму рад.
Адной нагой тут, а другой у Бэтлееме.
Аць-два, аць-два, аць-два...
***(Чуецца званочак)***
**Анёл:**
О, Ірадзе, Ірадзе,
Што ты нарабіў?
Сваю душу грэшную перад Богам загубіў.
Згінеш ты да звання,
Не будзе табе выратавання.
**Д'ябал:**
Ты, Ірад, яго не слухай!
Вазьмі сабе патыліцу пачухай.
Лепш быць каранаваным,
Чым выратаваным.
**Ірад:**
Твая праўда! А ну, пайшоў прэч адсюль!
А кыш!
***Дзея трэцяя***
***Песня "Неба і зямля" (1-ы слупок)***
Неба і зямля Радасна спяваюць.
Анёлы свету, анёлы свету
Дзіва абвяшчаюць.
***Прыпеў:***

Хрыстос нарадзіўся,
Бог аб'явіўся,
Анёлы спяваюць,
Пастушкі іграюць,
Дзіва, дзіва абвяшчаюць.

***(Уваходзяць пастушкі)***

**Пастушкі *(у адзін голас):***
Прымі, Марыя, сціплыя дары,
Якія Ісусу мы прынеслі.

**Пастушок 1:**
Катомку рыбы

**Пастушок 2:**
Белыя грыбы

**Пастушок 3:**
Ягнятка, каб шкарпэткі Богу плесці.

***Песня "Неба і зямля" (2-гі слупок)***
У Батліеме, у Батлііеме
Вясёла навіна:
Чыстая дзева, чыстая дзева
Нарадзіла Сына.

***Прыпеў:***
Хрыстос нарадзіўся,
Бог аб'явіўся,
Анёлы спяваюць,
Пастушкі іграюць,
Дзіва, дзіва абвяшчаюць.

***(Уваходзяць тры мудрацы, кожны з іх трымае для Бога дары)***

**Мудрацы *(у адзін голас):***
Вітай нас, Божае дзіця!
Мы абышлі нямала земляў,
Каб адалець нялёгкі шлях
З Усходу аж да Бэтлеема.

***(Мудрацы кладуць падарункі)***

**Марыя:**
О, дзякуй вам, тры каралі,
За падарункі, ласку, спевы.
За дабрыню хай Бог дае вам
Жыццё ў шчасці на зямлі.

***Песня "Неба і зямля" (3-ці слупок)***
І мы дзіцятку, і мы дзіцятку
Богу паклон дайма,
Слава на ўзвышніх, слава на ўзвышніх
Яму заспявайма.

***Прыпеў:***

Хрыстос нарадзіўся,
Бог аб'явіўся,
Анёлы спяваюць,
Пастушкі іграюць,
Дзіва, дзіва абвяшчаюць.

***Дзея чацвёртая***

**Зорнік:**

Усіх слабых на нервы
Прашу пакінуць залу!
Зыход наступнай сцэны
Жахлівы і лятальны.
Памінкі пасля піру,
А замест трона - плаха.
Я чую крокі - Ірад!
Хаваюся ад страху...

**Ірад:**

Я - цар Ірад
Я, я слаўны
Сяду на свой трон дзяржаўны.

**Ваяка:**

Аць-два, аць-два, аць-два, стой!
Цару, мой цару, любы гаспадару,
У Батлеем я схадзіў, усіх немаўлят забіў.

**Ірад:**

За добрую службу, за шчырую дружбу
На табе трошкі грошай.
Схадзі, пагуляй з раскошы.

**Анёл:**

Ірад ты нясыты, забойца самавіты,
За ўсіх дзіцятак, за ўсіх немаўлятак
Будзеш ты ў агні гарэць
Ды ў смале кіпець.

**Д'ябал:**

Ты, Ірад, на яго не зважай,
Пра ўладу лепш дбай.
Памятай, лепш быць каранаваным...

**Ірад:**

Твая праўда. А ну пайшоў прэч адсюль! Кыш

***(Уваходзіць Смерць)***

**Смерць:**

Здарова, Ірад!

**Ірад:**

А...вой...
Ваяка, мой ваяка, верны мой служака!
Ратуй! Гані ад мяне гэту пачварыну!

**Смерць:**
Твой ваяка-небарака, зайшоў да кабака,
Выпіў чарку, атрымаў па карку і ляжыць.
А я, Смерць касціста, маю касу сталісту,
Прыйшла цябе ў пекла справадзіць.
**Ірад:**
А... вой... Смерць-матухна,
Пачакай трошкі, не трымай на мяне злосці,
Дам я пурпуру на твае старэчыя косці.
**Смерць:**
Ірад, твая хаўтурная песня спета,
Згінеш ты зараз з гэтага свету.
Як ты немаўляткам, так і я табе
Касой галаву сагну...
**Ірад:**
Ой-ой-ой!
**Смерць:**
Жых!
***(Ірад падае мёртвы)***
**Д'ябал:**
Ха-ха-ха, цар-небарака, любы мой дружака,
Ну што, лепш быць каранаваным
Ці выратаваным?
Нічога, хадзем са мной у пекла.
Згінуў ты да звання, не будзе табе выратавання.
(Д'ябал цягне Ірада за сабой. На змену ім заходзіць ваяка)
**Ваяка:**
О, трошкі пагуляў
І свайго гаспадара прамаргаў.
Ды нічога!
Пазбыў пана, буду піць квас са збана.
Пець, танцаваць, Каляды сустракаць!

***Песня "Новарадасць стала"***

1. Нова радасць стала,
Што шчэ не бывала
Над Бэтлеем зорка ясна,
Свету заззяла.

2. Просім Цябе, Божа,
Просім, як хто можа:
Дай нам у небе жыццё шчасна,
На зямлі жыццё прыгожа.

**4.Абмеркаванне п'есы па пытаннях. Вучні садзяцца за круглым сталом , вядуць абмеркаванне па пытаннях:**

**1.**Якія традыцыйныя светлыя і цёмныя сілы прысутнічаюць у п'есе?
**2.**Выберыце для сябе любімага героя ў п'есе і абгрунтуйце свой выбар.

**3.**Якая роля песні, музыкі ў творы?
**4.**Калі б вы аказаліся на месцы пастушкоў, як бы вы паступілі?
**5**.Як вы думаеце, чаму такую радасць выклікае дзеянне дадзенай п’есы?

**5. Гульня-фізкультурная размінка “Скажы пра дабро без слоў”.** Дзеці становяцца ў адну лінеечку і жэстамі паказваюць добрыя адносіны адзін да аднаго. ( Мне з табою прыемна быць, я падзялюся з табою сваім прыгожым сакрэтам, ты самы лепшы сябар, дзякуй табе за ўсё…)
**Слова настаўніка.**Вы ўпэўніліся, што можна гаварыць пра дабро і без слоў. Дабро чалавек адчувае душой. І душа напаўняецца радасцю, што датыкнуліся да таямніцы самага прыгожага на зямлі – перамогі дабра над злом.
**6.Ці згодны вы з такім выказваннем “Мы развітваемся, каб хутка сустрэцца зноў”. Абгрунтуйце сваю думку.**
- Развітацца назаўсёды немагчыма, таму што карысна пазнаваць мудрасць жыцця праз далучэнне да Біблейскіх сюжэтаў. Сустрэчы толькі пачынаюцца.
- У душы застаецца святасць, цудоўная ўзвышаная музыка, якая нікога не можа пакінуць абыякавым.



*Рыхтуемся да выступлення*

Вострай праблемай сённяшняга грамадства, у тым ліку і нашага рэгіёна, з’яўляецца вялікая колькасць дзяцей, якія знаходзяцца ў СНС. А таксама не змяншаеццпа колькасць дзяцей, якім патрэбна дзяржаўная абарона. Атмасфера неблаганадзейнасці сям’і адчуваецца вельмі хутка. Яна характарызуецца дыскамфортам як матэральным, так і маральным, духоўным. Дзеці, якія жывуць у сацыяльным прыюце, маюць усё: смачную ежу, цёплыя пасцелі, ласкавых разумных педагогаў. І ўсё ж у вачах мы чытаем боль і горкую

крыўду. У сваім узросце яны ўжо адчулі ў сваіх душах, што ў жыцці бывае жах, абыякавасць, адзінота, неразуменне. З імі працуюць псіхолагі з мэтай вярнуць ім веру ў жыцце, у тое, што ў свеце многа цікавага і непаўторнага, што жыццё не само па сабе кепскае, кепскім яго часта робяць самі людзі. Таму патрэбна імкнуцца, нягледзячы на перашкоды, да дабра, да святла, да Бога. Бог – гэта сімвал любві, і гэта любоў не мае канца.

Кожная наша сустрэча з дзеткамі з СПЦ – гэта, перш за ўсё, абмен падарункамі, гутарка пра цікавыя надзённыя справы, паказ батлеечных спектакляў, якія дапамагаюць адчуць радасць жыцця, фарміраваць разуменне ролі чалавека ў акружаючым асяроддзі, развіваць у дзяцей пачуццё дабра, міласэрнасці, імкнення ў любы час прыйсці на дапамогу таму, хто папаў у цяжкія жыццёвыя абставіны.

## Сустрэча-адкрыццё “ Я ёсць. І гэта такое вялікае шчасце”

**Аўтары:** музычны кіраўнік ДУА “Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа дзіцячы сад-сярэдняя школа” Сас Л.С.., педагог дадатковай адукацыі Гунько А.А., вучань 10 класа Шаўлюк Ілля , вучаніца 11 класа Сянкевіч А.

**Мэта:** фарміраванне духоўна-маральнай культуры вучняў праз знаёмсва з біблейскім аповедам пра нараджэнне Іісуса Хрыста**.**

**Задачы:**

- пазнаёміць вучняў з біблейскім аповедам аб нараджэнні Іісуса Хрыста;
- прапагандаваць духоўна-маральныя традыцыі сродкамі тэтральнай дзейнасці;
- фарміраваць у навучэнцаў уважлівыя адносіны да свайго ўнутранага духоўнага свету, абуджэнне ў дзецях веры ў сябе, у сваіх блізкіх, у вялікую каштоўнасць жыцця.

**Мэтавая аўдыторыя:** выхаванцы ДУА “Сацыяльна-педагагічны цэнтр Карэліцкага раёна”

**Абсталяванне:** Біблія, рэпрадукцыя іконы Ражства Хрыстова, свечкі, сюжэтныя карціны Ражства Хрыстова, канструкцыя батлеечнага тэатра, выстава кніг “Біблейскія матывы ў творах беларускіх пісьменнікаў”.

**Тэхналогія рэалізацыі**

Для правядзення мерапрыемства неабходна:
-падрыхтаваць касцюмы і дэкарацыі;
- развучванне вершаў, песень духоўнай тэматыкі;

**Рэкамендацыі па правядзенню мерапрыемства:**

- правесці акцыю “Падарунак сябру”;
- змясціць рэкламную аб’яву  на сайт установы адукацыі;
- распрацаваць праграму мерапрыемства;
- вывучыць  кантынгент вучняў СПЦ

**Структура мерапрыемства:**

- правядзенне  уводнай гутаркі з выхаванцамі  СПЦ;
- паведамленне “Гісторыя нараджэння Хрыста”;
- прагляд  батлеечнага спектакля “Віфліемская ноч”;
- правядзенне гутаркі-рэфлексіі “Я пакіну для сябе на ўсё жыццё”;
- падвядзенне вынікаў, абмен падарункамі.

**Ход сустрэчы**

**Педагог.** Рабяты, раскажыце што самае добрае, цікавае адбылося ў вашым жыцці за апошні час?
**Выхаванцы**. На занятках мы рыхтавалі  падарункі нашым бацькам да свята, падрыхтавалі канцэрт нашым выхавацелям, нам прывезлі новыя цацкі, для нас правялі цікавае мерапрыемства “У краіне дабра”.
**Педагог.** А якое свята мы будзем хутка святкаваць?
**Выхаванцы**.    Ражство Хрыстова.
**Педагог.**А калі праваслаўныя людзі адзначаюць Ражство Хрыстова?
**Выхаванцы.**7 студзеня.
**Педагог.** А з якімі словамі асацыіруецца для вас Свята Ражство Хрыстова?
**Выхаванцы.**Прыгажосць, жыццё, мудрасць, міласэрнасць, чуласць, радасць, свет, цяпло, дабрата, дружба, разуменне, шчасце…
**Педагог.**А зараз паслухайце апавяданне пра з’яўленне Выратавальніка на нашу зямлю. (Вучань-старшакласнік зачытвае урывак з Бібліі)
“Людзі даўно чакалі  Выратавальніка. Прарокі прадказвалі, што Ён народзіцца ў Віфлееме. Дзева Марыя з Іосіфам жылі ў Назарэце, а Назарэт ад Віфліема быў далёка. Як жа адбылося прароцтва?  Аднойчы імператар загадаў зрабіць перапіс усіх жыхароў. Для гэтага кожны чалавек павінен быў вярнуцца ў горад, дзе жылі яго продкі. Іосіф з Марыяй адправіліся ў Віфліем, дзе нарадзіўся іх продак цар Давід.”(прагляд сюжэтнага відэафільма “Нараджэнне Ісуса Хрыста”)

**Педагог.** А зараз вашай увазе прапануецца прагляд спектакля тэтральнай студыі “Батлейка” “Віфліемская ноч”.

**“ВІФЛІЕМСКАЯ НОЧ”**

*Дзеючыя асобы: Сімон – гаспадар; Марфа – яго жонка; Сара – пляменіца Сімона, сірата;  Гандляр.*
**Вядучы:** Доўга скарб збіралі гэткі
І матулі, і дзядулі,

Каб яго пачулі дзеткі,
Каб дарослыя пачулі.
Пабяжыць наперагонкі
Да вас за казкай казка
З чарадзейнае скарбонкі,
Дык паслухайце, калі ласка.

***__1 дзея__***

**Марфа:** Сара! Зноў ты, гультайка, сядзіш без справы!
**Сара:** Прабач, цётачка Марфа! Я толькі на хвілінку адпачыць прысела. Замарылася… увесь дзень працавала,
**Марфа:** Нічога, не пераломішся. Ідзі чысці гародніну. Гасцей наехала - ух! Рабоце канца няма. Хутчэй!
**Сара:** Зараз, цётачка. Столькі гасцей, а я адна. Такога яшчэ не было – усе пакоі занятыя.
**Марфа**: Гэта праўда. Ні аднаго свабоднага месца не засталося. Гэта ўсё Указ кесара - перапісаць народ. Пагэтаму ў Віфліеме столькі народу сабралася, што не пералічыць.
*( стук у дзверы)*
**Гандляр:** Добры вечар, гаспадынька! Ці ёсць у вас месца для начлегу?
**Марфа:** Што ты, шаноўны, усё занята… Выбачай.
**Гандляр:** Я прыехаў у Віфліем з-за перапісу. Сям'я мая родам з Віфліему. Сам я займаюся продажам каштоўных камянёў. Мне бы пераначаваць толькі, я вельмі добра заплачу.
**Марфа:** Выбачай, усё занята, а накарміць – гэта можна.
**Гандляр:** Шкада, шкада. Я бы добра аддзячыў! Можа табе, гаспадынька, з майго тавару, што-небудзь спадабаецца. Глядзі – царскае ўпрыгожванне… Камяні гараць, аправа з золата!
**Марфа:** Ах, якая прыгажосць!
**Гандляр:** Я гатовы гэта за начлег аддаць. Згодна?
**Марфа:** Добра. Мне здаецца, што ў нас знойдзецца месца. Гэта пакой нашай пляменіцы. А яна і ў хляве пераначуе. Хадзем, шаноўны, правяду.
**Гандляр:** Вось, упрыгожванне, вазьмі.

***2 дзея***

**Сара:** Ну і дзянёк, змарылася. Дзядзечка Сімон! Добры мой дзядзечка!
**Сімон:** Што, дзіцятка маё!
**Сара:** Паабяцай, што можна!
**Сімон:** Што можна? Аб чым ты, мілая?
**Сара:** Там з Назарэта прыйшлі: стары чалавек і маладзенькая дзяўчына. Яны стаміліся.
**Сімон:** Усе сёння стомленыя за гэтага перапісу. Народ адусюль ідзе сюды. Ты скажы ім, мілая мая, што ў нас больш няма месца.
Сара: Дзядзечка! Я ім свій пакойчык аддам, можна? А я ў хляве, або ў пячоры пераначую.
**Сімон:** Ну, Бог з табою, вядзі.
**Сара:** Дзякуй, дзядзечка!

*Уваходзіць Марфа.*
**Марфа:** Ты ізноў адпачываеш?
**Сара:** Я ўсё зраблю. Вось толькі людзей у свій пакой правяду – дзядзечка Сімон дазволіў.
**Марфа:** Куды?
**Сара:** А я ў хляве, або ў пячоры пераначую. Яны такія стомленыя….
**Марфа:** Ты і так там будзеш начаваць.
**Сімон:** Ну, хопіць, Марфа!
**Марфа:** А ты не лезь. Я яе пакой ужо здала гандляру.
**Сара:** Яны ж стаміліся, цётачка…
**Марфа:** Слухаць не хачу. Выконвай сваю працу.
*Марфа выходзіць*
**Сімон:** Не плач, даражэнькая, не плач! Як небудзь прыстроім. Не плач!
**Сара:** Не магу я, дзядзечка, аставіць іх! Дзяўчына мне так усміхнулася, як мая мама. Яны добрыя і бедныя. Можа яны са мною ў пячоры пераначуюць, га?
**Сімон:** Яны, напэўна не згодзяцца?!
**Сара:** А я запытаю, можна?
**Сімон:** Ну, бяжы! Калі згодзяцца, то хай начуюць у пячоры.
***Песня «Динь-динь дон…»***

1. Динь-динь дон к нам в окно

Постучалось Рождество.
За окошком снег блестит,
Ёлка в гости к нам спешит.
Припев:
Динь-динь дон – 2 раза
За окошком Рождество.
Динь-динь дон – 2 раза
Рождество уже пришло.

2. Пригласим её к нам в дом,
   Пусть метели за окном.
   С доброй вестью волшебства
   В день Святого Рождества.

Припев:
***3 дзея***
**Марфа:** Гэй, Сімон, з кім ты там балабоніш?
**Сімон:** Марфа, я размаўляў з пастухамі. Ім абвясціў Анёлак, што нарадзіўся Збаўца свету. У яслях ляжыць…
**Марфа:** Не можа быць…
**Сімон:** Мне бы ім свой пакой уступіць. А я іх у пячору…
**Марфа:** Яму бы ў нас нарадзіцца… А мы,… а я…
*Уваходзіць Сара.*
**Марфа:** Сара, што ж я нарабіла….
**Сара:** Не плачце, цётачка Марфа.
**Марфа:** Я ж твой пакой ад іх адняла. І ўсё за гэтага ўпрыгожвання.
**Сара:** Але ж вы не ведалі.

**Марфа:** Не ведала – гэта так. Але ж і ты не ведала, але пашкадавала іх. А я і слухаць не хацела. Занясі, дарагая, ім гэта ўпрыгожванне. Яны бедныя, ім яно спатрэбіцца.
**Сімон:** Вось ты, Марфа, ім і дапамагла.
**Марфа:** Брыдка мне. Упрыгожваннем віну сваю не загладзіш. Вось можа ім месца ў доме даць?
**Сімон:** Цяпер позна!
**Марфа:** Ні колі не позна свой грэх скупіць. А давай, Сімон, станем да канца свайго жыцця адзін пакой для бедных астаўляць. Не за грошы, а так – у дар Збаўцу і яго Мацяры за нашу віну.
**Сімон:** Вось і добра. Значыць, і мы Яму дар прынясём…

***Песня "Звёздочки ярко сияли»***
1.Звёздочки ярко сияли
Над Вифлеемской землей,
В поле стада мирно спали –
Всюду был мир и покой.

Припев:
Младенец Иисус рождён был в ту ночь,
Чтоб людям страдающим в мире помочь.
Хвалу я пою ему одному, –
Христу моему.
(припев повторяется 2 раза).

2.Ангелы в свете небесном
Славу слагали Христу,
Но а в домах было тесно,
И он родился в хлеву.
Припев:

3.В маленьком детском сердечке,
О, поселись, Иисус.
Ты пастырь мой, я овечка
В небе с тобой быть стремлюсь.


*Удзельнікі п'есы*

Припев:
**Педагог.** Скажыце, рабяты, якую, на ваш погляд, заключае думку ў сабе дадзены спектакль, чаму ён вучыць нас?
**Выхаванцы:**
- вучыць любіць жыццё, захапляцца добрымі ўчынкамі;
- вучыць радавацца кожнаму новаму дню;
- адчулі, якое вялікае значэнне мае для нас Біблія. У ёй сапраўды заключана мудрасць. Гэта самая старажытная кніга;
- мы ўбачылі, як па-майстэрску прыгожа артысты паказалі нам адзін з

эпізодаў біблейскай гісторыі пра нараджэнне Хрыста.

**Падвядзенне вынікаў, рэфлексія.**

**Педагог.** Я прапаную вам, рабяты,выказаць сваю думку наконт нашай сённяшняй сустрэчы і пачаць сваё выказванне такімі словамі "Ад нашай сустрэчы я вазьму для сябе на ўсё жыццё….."

Выказванні выхаванцаў:

- пазітыўнае ўспрыманне ўсіх падзей жыцця. Вера, што ўсё ў мяне наперадзе будзе добра;
- разуменне таго, што ў жыцці ёсць рэчы галоўныя, гэта такія, як мір на зямлі, здароўе блізкіх, дружба ў сям'і;
- светлы настрой у душы;
- спакой і надзею на лепшае.

**Педагог.**Вера ў Бога, імкненне да Бога дае заўсёды радасную надзею на лепшае. А радасць, асабліва для чалавека, які толькі пачынае жыць, павінна быць прывычным пачуццём, такім, як паветра. Ад таго, што наперадзе вялікае, цікавае жыццё, новыя сустрэчы, каханне, шчасце. Як гавораць мудрыя людзі, мы не заўсёды атрымліваем тое, што на самай справе патрэбна на канкрэтным этапе жыцця. Але перамагаючы цяжкасці, становімся сапраўднай асобай, здольнай зрабіць жыццё шчаслівым і прыгожым як для сябе, так і для ўсіх акружаючых.



*Выступленне ў сацыяльным прытулку в. Палужжа*

**Тема: «Прошу прощения »**

**Цель:** формировать представления о необходимости самоисправления.

**Задачи:**
1) познакомить учащихся с днём «Прощёное воскресение»;
2) воспитывать любовь друг к другу, к старшим, к Богу, формировать умениепросить прощения у того, кого обидел, огорчил;
3) способствовать развитиюдобрых отношений со всеми окружающими.
Целевая аудитория: учащиеся 1 – 4 классов

**Ход занятия**

**1 этап.Организационный момент.**

Если будешь сам собой,
Будет мир всегда с тобой.
Если будешь честно жить,
Богу с верою служить.

Никого не обижать,
И обиды всем прощать,
Бог тебя благословит,
Все грехи тебе простит.

Все люди время от времени попадают в ситуацию, когда понимают, что сказали или сделали что-то не так. В такой ситуации, конечно, нужно попросить прощения, чтобы восстановить нарушенный баланс взаимоотношений. О том, как правильно просить прощения мы и поговорим на нашем занятии.

**2 этап. Беседа «Прощеное воскресенье».**

Последний день Масленицы – последнее воскресенье перед Великим постом. А потому в этот день отмечают Прощеное воскресенье, которое, по словам священников, помогает людям очиститься перед испытанием духа. В этот день принято просить прощение и прощать своих обидчиков. «Прости меня», - говорят, например соседи соседям. Им отвечают: «Бог простит, и ты меня прости» или «Господь простит, а я с радостью прощаю». Сначала - старшие у младших, а затем - младшие у старших.

По традиции, в этот день нельзя ни с кем ругаться. А если и возникнет какой-то конфликт, то его сразу же нужно уладить.

Просить прощение в Прощеное воскресенье принято не только у живых, но и умерших, приходя к ним на могилы. Ведь порой тяжкий груз остается на душе, когда человека нет в живых, и возможности попросить у него прощение уже никакой.

Просить прощение - давняя традиция, которая родилась в монастырях Палестины, где монахи весь Великий пост проводили в пустыне в полном одиночестве и возвращались в свои обители только на Пасху. Прежде чем удалиться, не желая уносить с собой ни вину перед близкими, ни чувство обиды, собирались вместе и просили друг у друга прощения.

Это замечательный обычай. Он настраивает человека на покаяние, смягчает сердца, готовит душу к Великому Посту. Хорошо, когда человек не только раз в году и не только по доброй традиции просит прощение, а всегда, когда

согрешает против ближнего. А еще важно, чтобы он чувствовал при этом раскаяние. Что такое, ребята, раскаяние?

Я приглашаю 3 желающих помочь нам ответить на этот вопрос. Перед вами на листочках записаны определения, выберите те, которые раскрывают значение слова *раскаяние.*

Н.П.

- это радостное известие;
- это признание своей вины;
- обида на друзе;
- это желание никогда не повторять недобрых дел;
- это не творить зла.

Раскаяние - это признание своей вины, желание никогда не повторять недобрых дел, не творить зла.

**3 этап. Как правильно просить прощение?**

Главное правило – делать это искренне и со всей душой, раскаиваясь в своем поступке. Священники советуют: если есть возможность встретиться и поговорить, не стоит ее упускать.

Скажите, пожалуйста, попросить прощения – это трудно?

(*Ответы учащихся*: да, нет)

А какие трудности испытываете вы?

*(Ответы учащихся)*

Как правильно просить прощение? Какими словами?

*(Ответы учащихся)*

Главное, чтобы ваши слова были сказаны сердцем, с осмыслением своего проступка.

**4 этап. Прослушивание «Притчио мытаре о фарисее». Обсуждение.**

Послушайте внимательно «Притчу о мытаре о фарисее»

(Пояснение.Фарисеи считали себя чуть не святыми, а мытари, сборщики податей были грешники. )

Вопросы для обсуждения:

- О чем говорил фарисей в своей молитве? ( *Учащиеся отвечают, что они поняли из молитвы фарисея)*.
- Была ли это благодарность Богу? Истинная благодарность почитает Подателя, а фарисей признавал только свои хорошие дела. О чем он просил Бога?
- Кого почитал фарисей? (*Ответы учащихся).* Себя. Фактически фарисей не молился Богу, он только возвеличивал себя, свое «я» и заслуги перед Богом. Фарисей очень гордился собой, считал себя лучше других, а в Библии написано: «Бог гордым противиться», то есть не слушает их.
- Как же молился мытарь? (*Ответы учащихся).*
- Как же Бог отреагировал на его молитву? Как вы думаете? *(Ответы учащихся)*. Бог оправдал его. Мытарь получил прощение.

Просмотр батлеечной пьсы«Бог прощает грех».

# “БОГ ПРОЩАЕТ ГРЕХ”

**Библейская истина для понимания:** Бог простит грех, если ты честно признаешься Ему и попросишь прощения.
**Куклы:** 2 шт. Гоша(Г.) и Петя (П.)
**Сценка:**
**П:** Привет Гоша!
**Г:** Привет Петя!
**П:** А ты что тут ходишь? Чего домой не идёшь?
**Г:** Да не хочу я домой идти. Убежал я из дома. От мамы убежал, от папы. Даже от папы больше чем от мамы.
**П:** Да? Ай-ай-ай. Как нехорошо. Нехорошо маленьким мальчикам убегать из дома. А что случилось Гоша, почему ты убежал?
**Г:** Да я окно разбил. Мячиком играл и разбил. Теперь папа меня наверное любить не будет…
**П:** Да нет, Гоша, это совсем не так, тебе нужно просто прийти к папе ичестно сказать ему, что это ты разбил окно и попросить у него прощения. Я знаю, что твой папа любит тебя и не будет всю жизнь сердиться на тебя если ты попросишь прощения у него.
**Г:** Ты так думаешь?
**П:** Да Гоша. Потому, что наш Небесный всегда так делает. Если мы согрешаем, а потом честно просим у Него прощения, то Он всегда прощает нас и больше не сердится. Так в Библии написано. Знаешь, в 1 послании Иоанна, написано, что *Если исповедуем грехи наши, то Он, будучи верен и праведен, простит нам грехи наши и очистит нас от всякой неправды.* Там есть одна история, когда один сын убежал из дома, и думал, что его отец никогда его не простит, а потом всё-таки решил вернуться и попросить прощения. И когда он пришёл домой, его отец принял его и простил его.
**Г:** Я сейчас же помолюсь и попрошу прощения у Бога за то, что я убежал из дома, а потом пойду домой и попрошу у папы прощения за то, что я разбил окно и убежал из дома.
**П:** Ты прав.
**Г:** Спасибо тебе Петя, что ты рассказал мне эту историю из библии. Я теперь всегда буду просить прощения у Бога когда что-нибудь нечаянно сделаю плохо и перед мамой с папой извиняться буду. А сейчас я пойду домой. До свидания Петя.
**П:** До свидания Гоша …

**Рефлексия:** (Все и ученики, и учителя становятся в круг)
Сейчас мы зажжем свечу. Передавая её друг другу, будем от чистого сердца желать доброго и светлого всем. После пожелания участник может произнести слова: «Простите меня!». Все отвечают: «Бог простит!»



*Выступление на чтениях,*
*посвящённых духовно-нравственному воспитанию, в г.п. Кореличи*

**Дадатак 1.**

**“ВЯЛІКДЗЕНЬ, ВЯЛІКДЗЕНЬ – НАЙВЯЛІКШЫ ДЗЕНЬ!”**

**Вядучы:** Над Галгофай - лобным месцам
Цемра лютая спаўзла.
Узышоўшы на Крыж страшны
Ісус перамог усю сілу зла!
Мукай той безчалавечнай,
Крывёю, што цякла з яго,
Збавіў Ён усіх ад смерці вечнай,
Падараваў усім нябеснае святло!
Унізе, ахутаны туманам,
Віднеўся горад з вышыні.
Над ім, як тыя веліканы,
Чарнелі грозныя крыжы.
Калі над горадам сцямнела
Сябры знялі з крыжа Хрыстова цела
І па тутэйшым тым законам
Яшчэ не пісаным канонам
У пячору цела палажылі
У плашчаніцу закруцілі
Ды цяжкім камнем увахад закрылі.

Туман разлажыўся над зямлёй паўсоннай...
Тры жанчыны па сцежцы ішлі.
І з маслам янтарным збанок благавонны
Да гроба Хрыстова няслі.
***(дзея ў батлейцы)*** Жанчыны – міраносцы падыходзячы да пячоры, з імі - Марыя.

- Хто ж нам адваліць камень, каб увайсці ў пячору?
- Не веру сваім вачам! Уваход адчынены! Што гэта?

**З’яўляецца анёлак:**

**Анёл:**Не пужайцеся! Не здзіўляйцесяі
Хрыстос уваскрос з мёртвых,
Смерцю смерць заваяваў,
і тым, што ў магілах, жыццё дараваў.
(Да пячоры падыходзіць Марыя.)

**Анёл:**

- Чыстая Дзева, радуйся, Твой Сын ўваскрэс на трэці дзень з гробу, і мёртвых ўзняў Ён, людзі, весяліцеся. Свяціся, свяціся, новы Іерусаліме, слава бо Господняя на табе заззяла. Ты ж, Чыстая, радуйся, Багародзіца, аб

Уваскрашэнні Народжанага Табой.

**Жанчыны:** Хрыстос уваскрэс!
Нам радасць прынёс!
Паўстаў і жыве!
Жыццё нам дае!
Крывёю Сваёй,—
Абмыў нас з грахоў!
Ён смерць перамог!
Ён - Збаўца, Ён - Бог!
Дзень поўны хвалы!
Узрадуйся й ты!
Вясёла спявай!
Хрыстапраслаўляй!

*Песня " Радасна мы славім Бога"*

1. Радасна мы славім Бога
Нам паслаўшага святло.
Як да сонца цягне кветкі,
Так сюды нас прывяло.
Узнімі туман сумлівы,
Хмары грэху прагані.
Дай нам ціха і шчасліва
Жыць па праўдзе ва ўсе дні.
2. З ласкі нам Табой даецца
Міласць, Вера і Любоў.
Ты ўсіх радасцей крыніца,
Акіян, святых дароў.
Песні радасці ад сэрца
У змаганнях на Зямлі
Паднімае нас да сонца
Кліча з Богам каб жылі!

**Вядучы:** У Святым Паданні апавядаецца, што аднаго разу Прэсвятая Багародзіца, прапаведуючы веру ў Хрыста, прыйшла да імператара Рыма Тыберыя са звесткай аб Уваскрашэнні Хрыста.

**Ваяка:** Хто ты, жанчына, адкажы?
Ды толькі праўду расскажы.

**Марыя:** Я - Марыя з горада Магдалы
Святую вестку прынясла
Аб слаўным Уваскрашэнні Хрыста!

**Ваяка:** Ведаеш ты, што з падарункам
Да Тыберыя ідуць.
Золата, мядок, тканіну
Усе яму нясуць.

**Марыя:** У мяне ёсцьтолькі
Белае яечка - сімвалжыцця .
А яшчэ ёсць вера
У Г оспада Хрыста.
Для людзей адчыніў Ён Райскія врата.

**Ваяка:** Твой падарунак вельмі бедны,
Але ў пас указ ваенны:
Калі дар нясуць цару-
Прапускаць усіх магу.

**Марыя:** Са светлай радасцю нябёсаў
К табе, мой цар, прыйшла,
Яечка ў падарунак
І вестку прынясла: "Хрыстос Уваскрэс!"

**Цар:** Не, жанчына, табе я не паверу,
Фантазіі і выдумцы ёсць мера!
Як не паверу я , што белае яечка,
Табой прынесеннае мне ў дар,
Раптоўна пачырванее,
Успыхне, як пажар.

**Словы вядучага:**
Цар змоўк. А з гэтымі словамі
Ззянне разлілося над галовамі.
Яечка кранулі цёплыя промні...
Яно запалілася, затрапятала,
І ярка-чырвоным адразу стала!

**Цар:** Вось дык цуд! Вось дык цуд!
Спрачацца я з табой не буду...

**Марыя:** Хрыстос Уваскрэс!
**Цар:** Сапраўды Уваскрэс!

**Вучні ( перад батлейкай)**
Найбольшае свята са святаў
Шануюць мае землякі:
Вялікдзень у кожную хату
Нясе хараство праз вякі.

Дзівосныя сілы прыроды
Абуджаны воляй святой.
Цякуць Іарданскія воды
І ў край беларускі. Ад той

Магутнешай веры Хрыстовай,
Што існасць і праўду нясе,
Прарочае Божае слова
Павінны засвоіць усе.

Яно нас натхняе на справу,
Ад немачы злой сцеражэ,
Прыносіць і веліч, і славу.
Дык што ж за яго даражэй?

З ім едзе ў поле араты,
Яго паўтарае жняя.
За нашы грахі Ён распяты:
Хрысту памалюся і я.

***<u>Песня: " Маліся з верою жывой"</u>***

1. Маліся, стаўшыся шчаслівым,
Маліся, змучаны бядой.
У чорны дзень, сярод сумліваў,
Маліся з верою жывой.
2. Маліся ў розных небяспеках,
Маліся, перад барадзьбой,
Аб мілых, блізкіх і далёкіх
Маліся з верою жывой.
3. Маліся, каб у грэх не ўпасці,
Маліся ўсякаю парой,

Ці сум, ці гора, ці няшчасце,
Маліся з вераю жывой.

**Вядучы:**Вялікаднем сонейка грае,
Напоўнены шчэбетам лес.
І вернікі ў храме спяваюць:
Для  ўсіх нас Хрыстос Уваскрэс!

**Вядучы:** А зараз запрашаем на Вялікдзень да дзеда Сцяпана і бабулі Параскі.

**Дзед:** Радасць прыйшла
Той, хто спазнае яе-
Не проста - багач.
**Баба:** Багацце, не ў мяхах і скрынях
Яно з Госпадам у сэрцы.
**Дзед:** І са справай у руках.
(*Стук у дзверы. Заходзіць унучка.)*
**Унучка:**  Бабулечка! Дзядулечка! Са святам вас, родныя!
Хрыстос Уваскрэс! 3 разы.
**Дзед і баба:** Сапраўды Уваскрэс! 3 разы

І цябе, наша разумніца, са святам!

**Баба:** Бачу, унучка, у вачах тваіх сон
Патрэбна прагнаць яго вон.
Зараз будзем вадзіцу для твара рыхтаваць
У яе чырвонае яйка акунаць.
**Унучка:** А навошта так рабіць
Калі можна калодзежнаю вадой вочкі памыць?
**Баба:** Павер'е існуе такое,
Што калі памыешся Велікоднай вадою
Збавішся ад усіх нягод
І будзеш здаровы ўвесь год.
**Дзед:** Гляньце, мае дарагія!
Сонейка заззяла,
Над краем узышло.
З нябёсаў нам паслала
Святочнае цяпло!
**Баба:** На першы дзень, на Вялікдзень
Сонейка праменіпь,
І людзей на працу ў поле запрашае!

**Унучка:** Свяцi, свяцi, сонейка,
Каб нам было цёпленька.
*Дзед, баба і ўнучка спяваюць: "Ой, вясна, красна, Велікодны дзень…"*
Ой, вясна, красна, Велікодны дзень.
Ой, люлі, люлі, Велікодны дзень.
У гэты дзянёк ды Хрыстос Васкрэс.
Ой, люлі, люлі,  ды Хрыстос Васкрэс.
Ой, вясна, красна, Велікодны дзень.
Ой, люлі, люлі, Велікодны дзень.

**Дзед:** Пачатак існай ранічкі –
Чароўнае праменне,
Сваточная зараначка –
Прыроды абуджэнне.

**Бабуля:** А зараз час свянцонай стравы настаў.
Да стала цябе, унучка, запрашаем,
З яек, хлеба і солі свята пачынаем!
**Вядучы:** А ў гэты час...
Сабраліся хлопцы, малады-малойцы,
Згаварыліся, ды й павалачыліся...
**Валачобнікі: (спяваюць каля батлейкі)**
Валачобнікі - валачыліся,
Хрыстос уваскрос, Сын Божы!
Валачыліся, намачыліся,
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы!
**Валачобнік**. Пойдзем, хлопцы, гуляючы, спяваючы,
Пана Бога пытаючы.
**Усе.** Пойдзем
**Валачобнік**.Укажы, Божа, дарогу.
**Валачобнік**. К добраму сялу.
**Валачобнік** . К слаўнаму пану Сцяпану.
**Валачобнікі: (спяваюць каля батлейкі)**
Валачобнікі - валачыліся,
Хрыстос уваскрос, Сын Божы!
**Бабуля:** Мае родныя, лета краснага дачакаліся
Зямлю-матухну абудзілі.
Сонца зайграла, на лета павярнулася.
**Дзед:** Не дапусцi, Божа стыхіі ды непагоды.

Чыстым чацвяргом умываліся,
Чырвонай суботай прыбіраліся.
**Баба:** Ды і валачобнікаў дачакаліся.
**Валачобнік**. Гэй, гаспадар!
Просім выйсці на ганачак,
Просім вынесці нам пачастуначак. .
**Валачобнік** . Во, не адзываецца, напэўна, прыбіраецца.
**Валачобнік** . Надзяе боты - Турэцкай работы.
Футру сабалёвую, шапку бабровую.
**Валачобнік** . Просім стаць на ганачак,
Просім вынесці нам пачастуначак.
**Дзед:** Заходзьце, заходзьце, госці дарагія!
**Валачобнік**. Добры вечар,
Дазвольце ваш дом павесяліць.
**Дзед:** Весяліце, весяліце, толькі хату не разваліце.
**Валачобнік** . Нічога, як гэту развалім - другую паставім.
**Валачобнік** . Дай табе Божа, добры гаспадару,
Сыноў гадаваці й дамы будаваці.
**Валачобнік .** Вядуцца хай цяляткі, авечкі і ягняткі,
Кароўкі, качкі, парасяты,
Куры і кураняты.
**Валачобнік** . Твая ніва хай будзе ўрадліва:
Чаго не пасееш - усяго займееш!

***Песня"Валачобныя - людзі добрыя"***
Валачобныя - людзі добрыя,
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы!
Небывалыя, пажаданыя.
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы!
Нячаста ходзім, нямнога просім,
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы!
Толькі ў гадочак адзін разочак.
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы!
Дай жа, Божа, пані гаспадыні
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы!
Жыці-быці, багацця нажыці,
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы! ) 3 разы

**Дзед:** Дзякуй, вам, за добрыя словы!
**Баба:** Няхай з вамі будзе Бог,

Каб нягоды ўсе абысці дапамог.
Даражэнькі механоша!
Вось для вашых дзяцей і ўсіх гасцей
Яйкі, кулічы,
Бяры ў мех і валачы!
**Валачобнік:** Дзякуй за тое, што адарылі,
Добрым словам прывіталі,
Са спагадай сустракалі.
Жывіце здаровы ды будзьце багаты.
Ды не самі з сабой, са сваімі дварамі.
Ды са сваімі з блізкімі,
І з блізкімі, і з дальнімі,
З пакрэўнымі ды прыяцелямі.

**Вядучы:** Вялікдзень,
Вялікдзень –
Найвялікшы дзень!
Зззяе сонечны прамень,
уцякае цень.
Гэтым днём Ісус Хрыстос
з мёртвых уваскрос.
Ён цянер глядзіць на нас
з вышыні нябёс.
Хто ў нядолі, хто ў бядзе,
Ён да тых ідзе,
Бо шануе нас усіх,
як дзяцей сваіх.
Зззяе сонечны прамень,
уцякае цень.
Вялікдзень,
Вялікдзень –
Найвялікшы дзень!
***Песня: "Анёлы ў небе высокім жывуць"***
1. Анёлы ў небе высокім жывуць
Богу Усявышнему славу пяюць
Да неба ўзносяць малітвы людзей,
Светлыя думкі дзяцей.
*Прыпеў:*
Божа, ты мой, сэрца адкрый,

Дай мне пачуць анёлкавы спеў.
Божа, ты мой, сэрца адкрый,
Я ведаю Ты, Бог, жывы.

2. Вечная радасць к нам з нябёс,
Хрыстос Васкрос! Хрыстос Васкрос!
І не пужайся, зямля, ты пагроз,
Калі ў сэрцы жыве Хрыстос.

*Прыпеў паўтараецца 2 разы:*

Вясёлы дзень для нас настаў,
Якога цэлы свет чакаў.
Збаўца Ісус наш Уваскрос,
Ён душам збаўленне прынёс.



*Падрыхтоўка да выступлення*

**Приложение 2**

**“Легенда о рождественских розах”**

**Рассказчик:** То было в давние года:
Над спящим миром ночь царила,
И светозарная звезда
Над Вифлеемом восходила.
И дети бедных пастухов,
Узнав, что родилсяСпаситель,
Со всех сторон, из всехшатров
С дарами шли в его обитель.
Несли ему ягнят живых,
И соты меда золотого,
И молоко от стад родных,
И хлеб от очага родного...
И только девочка одна,
В святой вертеп войти не смея,
Стояла поодаль, грустна,
А дети шли, смеясь над нею...
**Девочка:** «О, Боже!
**Рассказчик:** — плакала она.—
**Девочка:** Зачем меня Ты создал нищей?
Я одинока, я бедна...
С чем я войду в Его жилище?»
**Рассказчик:** Вдруг свет, как тысячаогней
Сверкнул вокруг во тьмеунылой,
И видит девочка: пред ней
Посланник небасвятокрылый.
**Ангел:** «Не плачь, бедняжка, не грусти! —
Промолвил кротко гостьнебесный. —
Ты можешь Богу принести
Своих слезинок дар чудесный.
Взгляни, малютка: на земле,
Куда твои упали слезы,

Там вырастают, там во мгле
Цветут прекраснейшиерозы.
Ты розы светлые сорви,
Иди к заветному порогу
И дар страданья, дар любви,
Отдай, дитя, Младенцу-Богу!»
**Рассказчик:** И вот с кошницею цветов,
Цветов, усеянных шипами,
Она вошла под Божий кров,
Сияя светлыми слезами...
**Девочка:**«Прими, Младенец, эти розы.
Ты ради нас родиться смог.
Они чисты, как мои слёзы…
Младенец, Ты наш вечный Бог».

**Рассказчик:** И ей в ответ в очах святых,
Как искры звезд, сверкнули слезы,
И изо всех даров земных Христос-Младенец выбрал розы..
Б. Николаев



*Первая репетиция с куклами*

**Дадатак 3**

## “РАДАСНА МЫ СЛАВІМ БОГА”

**Вядучы:** Вялікдзень свята ачышчэння,
Свята сонца і вясны,
З пакалення ў пакаленне
Аднаўляюць нас яны.

***Дзея ў батлейцы. Сустрэча двух хлопчыкаў.***

**Грышка:** Прывітанне, Сцёпка!

**Сцёпка:** Прывітанне, Грышка!
Бачу ў руках тваіх
З малюнкамі кніжка.

**Грышка:** Не простую кніжку трымаю я –
Гэта “Дзіцячая Біблія”.

**Сцёпка:** І ты, сябрук, яе чытаеш?
Аб чым там пішуць, ты хоць знаеш?

**Грышка:** Мой дружа, шмат я прачытаў
І вельмі многае спазнаў.
Наш Бог Ісус на свет прыйшоў,
Каб прапаведаваць любоў.
Любоў да блізкіх, да бацькоў,
Любоў да птушак і звяроў.
Лячыў Ён верай, словам Божым
І свята верыў у яго кожны.
Але ў ворагаў зайздрасць бушавала,
З вялікай сілай нарастала.

**Сцёпка:** Я ведаю, Грышка,
На крыжы быў распяты Хрыстос,
А на трэці дзень, пасля смерці, Ён уваскрос!
І мы з той нагоды Вялікдзень святкуем,

Ад уваскрашэння Хрыста ўсе лікуем!
Уваходзіць дзед.
**Дзед:** Прашу, унучкі, у вас дапамогі,
Бо ў мяне старога баляць ногі.
Патрэбна дровы ў павець знесці
І чыста на двэрэ падмесці.
Бо зараз Вялікі Тыдзень пачынаецца
Да свята кожны падрыхтавацца спяшаецца.
**Хлопчыкі:** Мы, дзядулечка, дапаможам!
Будзем дружна працаваць,
Будзем шчыра падмятаць!
**Грышка:** Дзядулечка, але вось нам цікава знаць
Так як я не паспеў прачытаць.
Чаму свята Вялікдзень назвалася
І, што за нядзелю да яго адбывалася?
**Дзед:** Дык, слухайце, мае сябры!
Пост да завяршэння імкнецца.
Перад Вялікай Седміцай
У нядзелю ў храм схадзілі
Вербачкі ўсе асвяцілі
Вербы ў храме асвяцілі,
Дома ля іконаў паставілі.
Ведаеце, хлопчыкі, панядзелак і аўторак
Седміцу пачынаюць.
Людзі на дварах і ў хатах прыбіраюць.
**Вядучы:** Сярод 12 вучняў Ісуса Хрыста быў адзін, Іуда Іскарыётскі. Які спачатку дапамагаў Госпаду ў пропаведзі і атрымаў ад Яго дар вызвалення ад хвароб. Але д’ябал спакусіў Іуду, і ён стаў коса паглядаць на Збаўцу. Іуда сустрэўся з іудзеямі, якія ненавідзелі Хрыста. І ў сераду…
***Дзея ў батлейцы. Размова іўдзеяў з Іўдай.***
**1 іўдзей:** Не верым мы ў яго намеры.
Усё тут зман, усё хлусня.
Напэўна Ісус у д’ябла ў даверы.
Нам прыпыніць яго пара.
**2 іўдзей:** А ты, Іуда Іскарыётскі, нам службу
За 30 срэбных саслужы.
І дапаможаш усім нам, дружа,
Калі Хрыста ты нам здасі.
**Іўда:** Я згодзен вам яго прадаць,

Ды трэба момант падабраць…
**Іўдзеі:** Дамовіліся! Ідзі!
***Песня “Божа, злітуйся над грэшным”***
Божа, злітуйся над грэшным,
Плач яго пачуй.
Іўды праступак цёмны, страшны,
Госпадзі, даруй.
Грэх ён бачыць прад сабою,
Мучыць ён яго
І віну яго крывавую,
Госпадзі, даруй.
**Дзед:** Сярод асаблівых дзён Вялікай Седміцы выдзяляецца, дарагія дзеткі, Вялікі Чацвер.
**Вядучыя:** 1. У тую ноч, калі Хрыстос
Чакаў канца свайго.
Ёе хлеб узяў, хвалу аддаў,
Ды паламаў яго.
2. І вучням даючы сказаў:
“Прыміце ж усе
Бо гэта цела ёсць Маё,
Што я за вас аддам”
3. Пасля вячэры чару ўзяў,
Узнёс, багаславіў:
“Вось гэта кроў Мая, сказаў,
Каб я за вас праліў”.
4. Ісус Хрыстос пасля Вячэры Тайнай
У сад Гефсіманскі завітаў,
Каб памаліцца перад выпрабаваннем,
З сабою вучняў Ён узяў.
5. Сюды ж з’явіўся Іуда здраднік,
З натоўпам воінаў, і ўраз,
Пацалаваў Хрыста адступнік
І Госпада схапілі ў той жа час.
**Дзед:** Іудзеі асудзілі Ісуса Хрыста на смерць за тое, што ЁН называў Сябе Сынам Божым. Іх слугі білі Госпада і здзекаваліся над Ім. У 12 гадзін дня ў пятніцу Ісус Хрыстос быў распяты на крыжы на гары Галгофе сярод двух разбойнікаў.
У пятніцу Вялікай седміцы
У храме вынас плашчаніцы.

Да яе з малітвай прыпадаем,
Мукі госпада ўспамінаем.
**Вядучы:** На крыжы прыбіты Бог – Сын цвікамі.
Плач, чалавеча, за грэ слязамі.
Зранена страшна Божае цела,
Залікае крывёю ў муках цярпела.
Коле карона галаву балюча, вусны спаліла смага пякуча.
Пад крыжам Маці плача, канае.
Матчына сэрдца жаль разрывае.
( эпізод фільма)
**Вядучы:** Калі над горадам сцямнела
Сябры знялі Хрыстова цела.
І па тутэйшым тым законам,
Яшчэ не пісаным канонам
У пячору цела палажылі,
У плашчаніцу абкруцілі,
Ды цяжкім камнем уваход закрылі.
**Дзед:** А ў суботу, мае дзеткі,
Да долу схіліліся нават кветкі.
Усе гаравалі, слязьмі дарогу палівалі,
Госпада Ісуса ціха адпявалі…
**Вядучыя:** 1. Спрадвечны Дух, пачуй мальбу, прыдзі хутчэй
І Царства праўды ўмацуй, сярод Тваіх дзяцей.
2. Дай нам адчуць яшчэ мацней,
Што Твой агонь не згас.
Што з намі Ты і ў ясны дзень,
І ў ноччу ў цёмны час.
3. Прыйдзі, Дух Божы, сэрцы напаўняй!
Што ў нас нягожа, Сам выкараняй.
Усемагутны, дух наш абнаві!
Дай прабываць нам у Тваёй любві!
4. Дай нам свядомасць блізкасці Тваёй,
Навучы змагацца, духам не ўпадаць,
Сумненняў месца ў сэрцы не даваць,
Прасіць, чакаць і цешыцца душой.
***Песня "Дай, Добры Божа"***
1.Дай, Добры Божа, зару і сонца бачыць.
Тваёю ласкай захавай ад грэху.
К Табе ўздыхае маё сэрца, плачыць,

Дай у Тваёй сіле мне знайсці ўцеху.
2. Ты свет уладзіў на людскую службу –
Такі карысны і такі прыгожы.
Каб увайшоўшы з гэтым светам у дружбу
Цябе хвалілі, найлепшы наш Божа.
3. Табе малюся, Божа міласцівы,
Дай мне ўбачыць свет Твой найяснейшы.
Цябе самога і усе ў небе дзівы.
Навекі вечны, Божа наймілейшы.
4. Будзь хвала Богу, Тройцы Ўсемагутнай,
І Жыватворнай, Вечнай назаўсёды
І Нераздзельнай, і Адзінасутнай
У Божай моцы знак любові, згоды.

**Вядучы:** Туман разлажыўся над зямлёй паўсоннай…
Тры жанчыны па сцежцы ішлі.
І з маслам янтарным збанок благавонны
Да гроба Хрыстова няслі.
**Дзея ў батлейцы. Жанчыны міраносцы падыходзяць да пячоры.**
**1 жанчына:** Хто ж нам адваліць камень, каб увайсці ў пячору?
**2 жанчына:** Не веру сваім вачам! Уваход адчынены! Што гэта.
**1.Анёлак:** Не пужайцеся! Не здзіўляйцеся!
Больш вам не трэба слёз.
Хрыстос, Збавіцель Свету,
З магілы ўваскрос!
**2.Анёлак:** Хрыстос Уваскрэс з памершых,
Смерцю смерць заваяваў.
Парваў Ён путы пекла,
Жыццё нам дараваў.

***Песня "Звяршыўся цуд Уваскрашэння"***

1. Звяршыўся цуд Уваскрашэння,
   Гроб сцераглі два дні дарма.
   Зямля затрэслася страшэнна –
   І ў гробе Госпада няма!
   Смерць патаптаў сваёю смерцю
   За нас распяты на крыжы,
   І чуюць радасную вестку:
   "Хрыстос ускрос!"- усім скажы.
2. Ад таго часу паўтараюць:

“Хрыстос Ускрос! Хрыстос Ускрос!”
І песня чыстая, святая
Звініць пад купалам нябёс.
“Хрыстос Ускрос!” –ускрэсні слова,
Духоўна мёртвых ажыві,
Каб сэрцы ўсіх былі гатовы
Для добрых спраў і для любві.

**Дзед:** Ну, што, хлапчукі, зразумелі,
Чаму свята Вялікаднем назвалі?

**Хлопчыкі:** Так, зразумелі.

**Дзед:** Бог даў чалавеку сумленне, каб ён мог пазнаваць, што добрае, а што дрэннае. Сумленне пабуджае рабіць дабро і асцерагацца зла.
Хваліце ж, дзеткі, Бога, хваліце,
Хвалу спявайце, пашвну чыніце!
Хай Хрыс заўсёды з вамі будзе!
Памятайце, дзеткі! Ён ніколі пра вас не забудзе!

**Вядучыя:**

1. Звяры Вялікдзень чуюць, птушкі,
І хвоі гэтыя, і елі,
Ліхія людзі падабрэлі,
Бо святам Божым усюды вее;
З нажом разбойнік не пасмее
Залегчы ў лесе сярод дарогі,
Бо і заможны, і ўбогі
Святы Вялікдзень святкуюць
І радасць у сэрцы сваім чуюць.
2. Хрыстос Васкрос!” – з гары-званіцы
Вяшчае першы звон шчасліва.
Народ увесь, бы ў полі ніва
Буйнымі гнецца каласамі,
Скланіўся ціха галавамі.
А пачакаўшы з паўгадзіны,
Нясуць жанкі, нясуць мужчыны
Кашы, каробкі, паўасміны
І ставяць ў рад на цвінтары
Усе велікодныя дары.
3. Вясна шуміць, вясна гудзе,
Вялікдзень па зямлі ідзе.
Ліецца песня да нябѐс:

Хрыстос Васкрос! Хрыстос Васкрос!

4. Звініць званочкамі ручэй,
Заззялі сонейкі ў вачах.
За цѐмны лес пабег мароз..
Хрыстос Васкрос! Хрыстос Васкрос!

5. Зямля на сонцы грэе бок,
Чароўны белы галубок
Святую вестку нам прынѐс:
Хрыстос Васкрос! Хрыстос Васкрос!

6. Сыходзіць з твараў сумны цень,
Святочны час, святочны дзень,
Вясна, вясна - пара дзівос:
Хрыстос Васкрос! Хрыстос Васкрос!

Песня "Радасна мы славім Бога"

***Песня "Радасна мы славім Бога"***

1. Радасна мы славім Бога
Нам паслаўшага святло.
Як да сонца цягне кветкі,
Так сюды нас прывяло.
Узнімі туман сумлівы,
Хмары грэху прагані.
Дай нам ціха і шчасліва
Жыць па праўдзе ва ўсе дні.

2.З ласкі нам Табой даецца
Міласць, Вера і Любоў.
Ты ўсіх радасцей крыніца,
Акіян, святых дароў.
Песні радасці ад сэрца
У змаганнях на Зямлі
Паднімае нас да сонца
Кліча з Богам каб жылі!



*Выступленне ў Храме Свята Пакроўскай царквы в. Турэц*

**Дадатак 4**

**“МАТУЛЕЧКА БОЖАЯ, МАТУЛЕЧКА ДОБРАЯ”**

***У батлейцы знаходзяцца лялькі: “****Святы Андрэй”, “вучань Епіфаній”, 2 “жанчыны”, “мужчына”*

**Вядучыя каля батлейкі:**

1. У нядзелю на ўсяночнай
Ва Улахернскай царкве
Народ сабраўся кагортай поўнай
Усе былі ў малітвах і журбе.

2. Маліліся і слёзы пралівалі
Пра тое каб сарацынаў хутчэй прагналі.
Шапталі ціха, прыпадалі на калені.
Чакалі ўсе ад Госпада збаўлення.

1. На службе быў Святы Андрэй.
Стаяў ён моўчкі ля дзвярэй.
А побач – вучань Епіфаній
Чытаў малітву ў старанні.

***(малітва “ Отчэ наш”)***

**Вядучы:**Да неба галаву падняў Святы  Андрэй
І, цуд, не маог звясці вачэй…

***(З залы павольна ідуць да батлейкі вучні, у руках лялькі: “Марыя” і “Анёлкі”)***

**Вядучы:**Грэшных людзей не цуралася,
З нябёсаў у з’зянні Марыя спускалася.
Ішла па паветры бясшумна і светла
І ўсім усміхалася чыста і ветла.
А з ёю анёлкі і мноства святых
Прыйшлі памаліцца за ўсіх.

**Дзея ў батлейцы**

**Жанчына 1:**Ратуй Марыя, хрыстова Маці,
Дазволь нам грэшным Табе чэсць даці,
Прымі і нашы просбы нізкія,
За нас маліся – Маці Марыя.

**Мужчына:**Поўная пакоры, згодная ціхая,
Дай людзям згоду ў нашым караі.
Між нас хай згінуць сваркі ліхія,
Беражы нас ад войнаў Святая Марыя.

**Жанчына 2:**Уладарка наша, між херувімаў,
Пачуй наша маленне,
Што ідзе пад ногі твае святыя.
За нас маліся – Маці Марыя.

**Мужчына:**О, Марыя, Маці Бога,
Ты не гардзіш анікога.
Хто ў нядолі, ці ў патрэбе
Звернецца пад трон твой у небе.
О, Марыя, малі Сына,
Ты надзея наша адзіна.

**Вядучы:**Маці Божая на зямлю ступіла,
Са слязьмі на калені ўпала
І стала маліцца за ўсіх хрысціян,
Каб збярог Бог іх ад войнаў і ран.



**Марыя:** Глянь, о, Божа, з вышыні
На людзей, на Тваю працу!
На свій шлях усіх вярні,
Памагай з грахом змагацца.
Магутны Божа! Уладар Сусветаў,
Вялікіх сонцаў і і сэрц малых
Над Беларуссю ціхай, ветлай
Рассып праменне сваёй хвалы.*Рэпетыцыя п'есы "Матулечка Божая, Матулечка Добрая"*

**Вядучы:** А затым узняўшы з сябе пакрывала
Над усімі людзьмі яго распрастала.
Ад ворагаў лютых народ увесь закрыла
І была ў тым покрыве Божая сіла.

**Вядучыя:**
1.З падзеі далёкай ляцелі стагоддзі,
Але засталася вера ў народзе
Пра сілу святую Маці Марыі
Заступніцы нашай і херувімы.
Яе пакрывала і цяпер над народам
І вера мацнее ў святасць яе год за годам.

2. Маліцеся людзі, каб у грахі не ўпасці!
3. Маліцеся людзі, за здароўе і шчасце!
4. Маліцеся дзённа. Маліцеся ноччу!
5. Маліцеся ўсе аб тым хто захоча!

***Песня "Малiся з вераю жывой"***

1. Маліся, стаўшыся шчаслівым,
   Маліся, змучаны бядой.
   У чорны дзень, сярод сумліваў,
   Маліся з вераю жывой.

2. Маліся ў розных небяспеках,
   Маліся, перад барадзьбой,
   Аб мілых, блізкіх і далёкіх
   Маліся з вераю жывой.

3. Маліся, каб у грэх не ўпасці,
   Маліся ўсякаю парой,
   Ці сум, ці гора, ці няшчасце,
   Маліся з вераю жывой.

**Вядучы:**

1. Тыдзень Маці прымеркаваны да вялікага рэлігійнага свята – Пакровы Маці Божай, якое адзначаецца заўсёды 14 кастрычніка.

2. Голас маці, нібы калоссе, заўсёды звініць у душы.
3. Голас незнаёмага можа здзівіць,
4. Голас любай – на хвіліну спыніць,
5. Голас маці – вярнуць з таго свету.

6. Так, як маці, ніхто не ўмее на свеце
   За дзяцей хваляваецца і перажавць.
   Так, як маці, ніхто не ўмее на свеце
   Немаўлят сваіх песціць, калыханку співаць.

7. Я слаўлю мамы светлае імя -
   Пяшчотнае, нібы яблынь квецень.
   Матулінага сэрца цеплыня
   Нас саграе лепш за ўсё на свеце.

8. Я слаўлю мамы светлую душу,
   Яка разумее нас з паўслова.
   Я толькі маму памагчы прашу ,
   Калі жыццё паставіцца сурова.

9. Я слаўлю позірк маміных вачэй,
   Якія бачаць, што нам не вядома.
   Даруйце боль праплаканых начэй,
   Калі нас доўга не бывае дама.

10. Я слаўлю маму, бо яна – як Бог –
    Усім прабачыць і ўсё даруе,
    Яна для нас сабою ахвяруе,
    Як аніхто пакуль яшчэ не змог.

11. Ёсць матчына любоў.
Яе не зблытай
З ніякай, бо няма нідзе такой –
Пяшчотнай, безкарыслівай, адкрытай.
**Усе разам:** Шчаслівы ты, пакуль яна з табой.

***Песня "Матулечка Божая"***

1. Матулечка Божая, Матулечка Добрая,
Бедныя дзеці мы клічам Цябе;
Песьняй пакорнай малітвы складаючы,
Сэрцы свае аддаём мы Табе.

2. Нас, сваіх дзетачак, што ў Цябе просяцца –
Матулечка Добрая, Ты пашкадуй;
Ласкай аджыўчаю Бога прадвечнага,
Матулечка Божая нас абдаруй.

3. Вылеч Ты сэрца нам раны глыбокія,
Міласцяй чыстаю нас запалі,
Каб хвала Божая, не жальба вечная,
У неба ляцела, ляцела з зямлі.

4. Светам нябесным жа галовы цёмныя,
Матулечка Божая, ты асвяці,
Каб мы пазналі ўсе Мудрасць адвечную,
Богу служылі тут на зямлі.







*Выступленне на свяцепрысвечаным у Дню Маці*

**Дадатак 5**

**Сцэнарый свята САРАКІ**
**“ Птахі з выраю вяртаюцца, людзі сонцу ўсміхаюцца…”**

**Вядучыя:**

1. Прывітанне ўсім, хто ў гэтай зале!
Да нас вясна ідзе, сонейка нясе!
Спяшайцеся, людзі добрыя!
Спяшайцеся, людзі званыя!

2. Міласці просім
Завітаць да нас ў госці!
З намі разам пойдзем
І радасць знойдзем

1. Будзем песні спяваць,
Весяліцца, гуляць
Ды вясну сустракаць!

***Песня “ Вот весна пришла, ликуйте..”***

Вот весна пришла, ликуйте!
«Здравствуй!» – скажем ей.
По земле бежит в припрыжку
Маленький ручей.

За окошком светит солнце,
И лучи, звеня,
Скачут тихо по дорожке,
В храм зовут меня.
Из-под снега появились
Первые  цветы.
Всех друзей с весной поздравить
Поспеши и ты!

**<u>Дзея  каля батлейкі</u>**

***Першы хлопец:***
Гэй, хлопцы, хадзем на рэчку, па лёдзе пакоўзаемся!
***Другі хлопец:***
Не, нельга сёння на рэчку. Хіба не чуў, што сёння Саракі? У народзе кажуць: На Саракі — не суйся блізка да ракі.
***Трэці хчопец:***
Што гэта за свята такое? Чаму так называецца?
***Другі хлопец:***
А вось мы зараз пойдзем да бабулі Веры, яна ўсё ведае.
**<u>Дзея ў батлейцы.</u>**
***Першы хлопец:***
Добры дзень, бабуля! Прыйшлі цябе праведаць ды пра сённяшняе свята распытаць.
**Бабуля:** Добры дзень, мае даражэнькія!
А вось адгадаеце мае загадкі і самі ўсё зразумееце! Згодны?
***Трэці хлопец:***
Так, бабуля, загадвай!
***Бабуля:***Слухайце, даражэнькія.
Праз горы, даліны,
Праз тысячы сёл
З далёкай краіны
Вярнуўся пасол.
.. Спаважны, чыноўны,
Ён стаў на страсе
У ботах чырвоных,
Каб бачылі ўсе. *(Бусел.)*
*У* пагодлівы дзянёк
Недзе з паднябесся
Пералівісты званок

Славіць працу песняй. *(Жаўранак.)*
Спераду шыльца,
Ззаду вільцы,
Наверсе чорная палатка,
Спінка роўна ды гладка. *(Ластаўка.)*

***Бабуля:***

Ну што, зразумелі, чаму свята мае такую назву?

***Дзеці:***

Так, бабуля. Бо ў гэты дзень птушкі з выраю вяртаюцца.

**Вядучы і дзяўчынка ў касцюме "жаваронaчка"**

**Вядучы:** - Жаваронак, жаварончык!
Ты куды ляціш, званочак?
**Дзяўчынка:** - Шлях трымаю ў карай бацькоўскі,
Ён мілей зямель заморскіх.
**Вядучы:** - Праўда?
**Дзяўчынка:** - Праўду гавару
І дамоў з вясной лячу.
**Вядучы:** Птахі з выраю вяртаюцца
У родны край, у родны кут.
Шлях нялёгкі ім скараецца:
Гнёзды іх чакаюць тут.
Ой вы, бежанцы крылатыя!
Хай напоўняцца ўсе
Вашы гнёзды птушанятамі,
Сонейка цяпло нясе!

***Бабуля:***

Даўней казалі, нібы на Саракі прылятае сорак выраяў і ўжо канчаткова прыходзіць вясна. Але ёсць меркаванне, што па царкоўнаму календару назва свята пайшла ад сарака чалавек, што пакутавалі ў Севасційскім возеры каля 320 года.

**Вядучыя:**

1. Прыкладна ў 320 годзе каля Севасційскага возера адбылася трагедыя. У 40 воінаў – хрысціян патрабавалі адступіцца ад веры ў Хрыста. Калі яны не згадзіліся, ваеначальнік Агрыкола загадаў загнаць іх ў ледзяную ваду возера.
2. На беразе паставілі баню, каб жадаючы адмовіцца ад веры змог атагрэцца. Раніцай адзін воін з 40 пабег да бані і, толькі ўвайшоў у цяпло, адразу памёр.
3. Назіраючы за вытрымкай воінаў вартавы Аглайя сам зайшоў у ваду са словамі " Я верую ў Цябе, у Якога гэтыя воіны веруюць. Далучы і мяне да іх. Я

– хрысціянін!”

4. Заўважыў ваеначальнік, што воіны не замярзаюць, как як лёд на возеры растаў івада стала цёплай. Раз’юшаны ён загадаў перабіць ім калені і спаліць.

5. Праз тры дні пасля кары воінаў блажэннаму Пятру прысніліся пакутнікі. Яны прасілі яго захараніць іх астанкі.

6. Ноччу епіскап Петр і некалькі клірыкаў з павагай пахавалі сабраныя рэшткі спаленых.

З тых часоў у гонар мужнасці і адданасці веры ў Хрыста праводзяцца ў храмах малебны і літургіі.

***Песня “Рашыўся я, Збавіцель, ісці з Табой”***

Рашыўся я, Збавіцель, ісці з Табой,
Каб ціха ўсё прымаці з рукі Тваёй.
Да ног Тваіх прыпасці хачу ў мальбе,
У шчасці ці няшчасці любіць Цябе.

Калі згублю ў задуме Твае сляды,
Вядзі мяне дадому, як знаеш Ты.
Вядзі мяне за рукі, Збавіцель мой,
Рашыўся я навекі ісці з Табой.

**<u>Дзея ў батлейцы</u>**

**Бабуля:** Ведаеце, дзеткі, існаваў звычай, у дзень памяці Севасційскіх пакутнікаў ляпіць з цеста і выпякаць “жавароначкаў”.

**Хлопец:** Бабулечка, а чаму жавароначкаў?

**Бабуля:** Лічылася, што спеў жаваронкаў – гэта песня славы Госпаду, узнёслую пакутнікам, іх імкненне ў Царства Нябеснае, да Сонца Праўды, да Хрыста.

**Хлопец:** Цяпер нам зразумела, чаму свята мае такую назву

**Хлопец:** Сумная гісторыя.

**Бабуля:** Ведаеце, дзеці, з гэтага дня дзяўчаты і хдопцы хадзілі “гукаць” вясну.

**Хлопец:** А як гэта?

**Бабуля:** Моладзь дружна збіралася на ўзгорку. Яны спявалі песні-вяснянкі, вадзілі карагод. Было весела!

**Дзея каля батлейкі**

**Дзяўчынка-вяснянка:** Гэй, дзяўчынкі, выходзьце!
Будзем песні спяваць,
Ды вясну гукаць!

*Выходзяць дзяўчынкі. Дзяўчынка-вяснянка падае ім стужкі. Вокол яе дзяўчаткі ўтвараюць “кола”, хадзяць па крузе.*

**Дзяўчынка-вяснянка:**

Вясна, вясна красная,
Прыйдзі, вясна з радасцю…
*Дзяўчынкі ўздымаюць рукі: У-у-у…*
**Дзяўчынка-вяснянка:**
З дажджамі моцнымі,
З хлябамі багатымі…
*Дзяўчынкі ўздымаюць рукі: У-у-у…*
**Дзяўчынка-вяснянка:**
Вясна, вясна красная,
Прыйдзі, вясна ясная…
*Дзяўчынкі ўздымаюць рукі: У-у-у…*
**Дзяўчынка-вяснянка:**
Прыйдзі да нас хутчэй,
Сонейкам нас абагрэй…
*Дзяўчынкі ўздымаюць рукі: У-у-у…*
***Песня "Жавароначкіпрыляціце"***
Жавароначкі прыляціце!
Вясну красную прынясіце,
Каб сонейка засвяціла,
Каб снег белы растапіла,
Каб садзікі расквяціла.

Жавароначкі прыляціце!
Зямлю-матухну абудзіце
І дожджыкам напаіце,
Каб травачкі нарасціла
І волікаў накарміла.

Свята песенькай сустракае.
Вясну  весела мы гукаем.
Ходзім радасна карагодам,
Выглень сонейка, дай пагаду.
Жавароначкі прыляціце!
Цёпла лецейка прынясіце!



*Рыхтуемся частаваць усіх печывам*

<u>**Дзея ў батлейцы**</u>

**Бабуля:** А  расказаць вам, як гэта свята адзначалі гаспадыні?
**Хлопцы:** Так раскажыце, калі ласка.
**Бабка:**А гаспадыні выпякалі ў гэты дзень для дзяцей 40 жаваранкаў з цеста і клалі ў адзін з іх «саракоўку» — 20 капеек. Каму яна дастанецца — той

будзе шчаслівы. Ія для вас, мае дзеткі, прыгатавала печыва. Частуйцеся, калі ласка.

*Усім прысутным раздаюцца выпечаныя "жаваронaчкі".*

**Вядучыя:**

1. Хай вам, людзі, будзе даспадобы

Веснавы іцёплы гэты дзень,

2. Каб заўсёды вы былі ў згодзе

Кожны час і кожны дзень.

3. Каб заўсёды дзеці ўсміхаліся,

І свяціла сонца над зямлёй,

4. Каб жылі ў згодзе, працавалі

Моцнаю і дружнаю сям'ёй.

5. Яснага блакітнага вам неба,

Светлых зорак усім вам у начы,
Каб на стале заўсёды быў кавалак хлеба,
**Усе:** Каб святло вы неслі ў сваёй душы!

**Дадатак 6**

## "САМЫ КАШТОЎНЫ ПЛОД"

**Вядучы:** На схіле веку пагукаў стары сыноў у хату ізагаварыў:
**Бацька**: —Вось перад вамі золата мяшок —
Усё,
Што зарабіць рупліва змог.
Сабе вазьміце золата
Із богам
Збірайцеся у дальнюю дарогу.
Хто плод каштоўны самы прынясе,
Таму аддам адразу грошы ўсе.
**Вядучы:** Сыны ўзялі па прыгаршчы манет,
Каб абысці з наказам белы свет.
Над галавою —
Зорак карагод.
Дзе адшукаць каштоўны самы плод?..
Старэйшы сын прыйшоў праз тры гады.

**Бацька:** - Каштоўны самы плод ці выбраў ты?
Старэйшы сын: Так!
Плод найкаштоўны —
Ён салодкі самы.
Няхай жа прынясе табе ён радасць...
**Вядучы:** Паклаў на стол ён гронку вінаграду.
**Бацька:**- Выдатны плод ты падарыў, сынок...
А ты, сярэдні сын,
Знайсці што змог?
**Сярэдні сын:** - Пабачыць давялося шмат мне свету.
Каштоўны самы плод,
Што самы рэдкі,
Какосавы арэх табе прынёс,
Бананы,
Іхурму,
Іабрыкос...
Ты выберы сабе па густу, тата,—
Няхай жа прынясе табе ён радасць.
**Бацька:** - Выдатныя плады прынёс, сынок...
А сын малодшы,
Што знайсці ты змог?
Няўжо была твая дарога крукам,
Бо бачу у цябе пустыя рукі...
**Малодшы сын:** - Так, тата,
У мяне пустыя рукі,
Ды не была мая дарога крукам.
Іграшы я пусціў не на плады,
А правучыўся цэлых тры гады.
Мае плады —
У розуме і сэрцы,
Ігэта даражэй за ўсё,
Паверце...
**Вядучы:** Расчуліўся стары, Сказаў:
**Бацька:** —Сынок,
Ты лепшыя плады прынесці змог.
Бо чалавек заўжды павінен ведаць:
Няма пладоў каштоўнейшых,
Чым веды.



*Рэпетыцыя п’сы “Самы каштоўны плод*

# Фотагалерэя тэатральнай студыі«Батлейка»











# Нашы выступленні















